Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б

ВЕРАСЕНЬ 21 1933 г. ЧАЦЬВЕР № 209 (4753) Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

1-118. МОСКВА-Ст. Площадь 4
ЦК ВКП (б) газетным сектору
на 1933 г. (Зв.2)
АДНО

НАРАДА САКРАТАРОЎ РК 13 РАЁНАЎ У ВІЦЕБСКУ

ВІЦЕБСК, 20. (Па тэлеграфу). 19 верасня пры віцебскім гаркоме партыі пад кіраўніцтвам сакратара ЦК тав. **ШАРАНГОВІЧА** адбылася нарада сакратароў райкомаў і старшынь райвыканкомаў 13-ці раёнаў паўночнай зоны. Прадстаўнік кожнага раёна зрабіў на нарадзе інфармацыю аб ходзе гаспадарча-палітычных кампаній—сяўбы, збожжапаставак, бульбапаставак, ільноўборкі, зяблёва і інш. З вялікай заключнай прамовай—аналізам прычын адставання раду раёнаў паўночнай зоны і вызначэннем канкрэтных задач далейшай работы—выступіў тав. Шаранговіч.

Збожжапастаўкі трэба арганізаваць

Збожжапастаўкі ў гэтым годзе праходзяць непараўнальна лепш, чым летась. Гэта рэзультат вялізарных перамог, дасягнутых нашай партыяй у барацьбе за арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў, рэзультат значнага паляпшэння якасці кіраўніцтва па вёсцы. Упор па высокую якасць уборкі і абмалоту, на барацьбу са стратамі забяспечыў павялічэн не вагі працаўдня і далейшы магутны ўздым дабрабыту калгасных мас.

Ёсць дзесяткі сельсоветаў і калгасаў, якія выканалі свой гадавы план збожжапаставак. Калгасы МТС Лельчыцкага, Рагачоўскага і інш. раёнаў ужо скончылі пастаўкі. Мы ў мінулыя гады ніколі не мелі такога становішча, каб да сярэдзіны верасня было ўжо здана 50 проц. гадавога плана.

Аднак, посьпехі першых месяцаў збожжапаставак ускружылі галовы многім мясцовым арганізацыям. Яны паддаліся настроям самацёка, пакінулі збожжапастаўкі без увагі.

Усямерна змагаючыся з рэкордсменствам, з давядзеннем сустрэчных планаў, як з варожай дзейнасцю, пакіраванай на падрыў давер'я да закону, мы ў той-жа час ні ў якім разе не павінны дапусціць малейшага аслаблення большэвіцкай барацьбы за збожжа. А гэта аслабленне наглядаецца ва многіх раёнах. Чым іншым можна тлумачыць той факт, што Горацкі, Заслаўскі, Полацкі, Расонскі раёны выканалі менш 30 проц. гадавога плана?

Чым іншым можна тлумачыць тое, што дагэтуль не ліквідаваны разрыў паміж уборкай і абмалотам—у той час, як з поля звезена 92,4 проц. жатага збожжа, абмалочана толькі 39,5 проц.; за другую пяцідзённку верасня паступіла 7.360 тон збожжа, а за трацюю—6.790. Гэта зніжэнне тэмпаў збожжаздачы сведчыць аб поўным самацёку ў гэтым паставак. Мы значна адсталі ад Заходняй вобласці. Заходняя вобласць апярэдзіла нас, вы канаўшы гадавы план на 55 проц.

Збожжазгатоўкі трэба арганізаваць. Гэты лозунг поўнасцю захоўвае сваю сілу і ў даны перыяд.

Самым небяспечным было-б зараз праглядзець за сярэдняй лічбай выканання плана (50 проц. гадавога задання) адставанне паасобных раёнаў і ўчасткаў, недаацэньваць таго супраціўлення, якое аказвае класавы вораг барацьбе за збожжа. Калі рад раёнаў, МТС, калгасаў дэманструюць перамогу новых метадаў партыйнага кіраўніцтва ёсць значна многія раёны, сельсоветы і калгасы, якія рэзка адстаюць. Пад прыкрыццём благадушных настрояў, выкліканых першымі поспехамі, класавы вораг пляне павуцінне шкодніцкіх зладзейскіх махінацый.

Мы маем факты пакідання ў полі дзесяткаў га збожжа, якое гніе пад дажджом. Мы маем факты шкодніцкага абмалота, калі ў саломе застаецца 20-30 проц. збожжа.

Жнівеньска - верасневуські план збожжапаставак выканан на 73,9 процантаў. Але паглядзеце, як здаюць збожжа **кулацкія гаспадаркі.** Яны карыстаюцца аслабленнем класавай пільнасці і сабатуюць здачу прадукцыі дзяржаве. Кулацкі сабатаж мінулага года пічому не павучыў многія раённыя арганізацыі. Кулацкія гаспадаркі да 15 верасня здалі толькі **13,4 проц. гадавога плана.** На Быхаўскім, Бягомльскім, Бялынічскім, Горацкім раёнах збожжа ад кулакоў зусім не паступае. Возьмем **Уздравіцкі** раён, які выканаў 66,3 проц. Рад перадавых калгасаў раёна скончылі здачу збожжа, з гонарам выканалі свае абавязкі перад дзяржавай. Захаваўшыся гэтымі поспехамі, раённыя арганізацыі выпусцілі з-пад увагі аднаасобны сектар, не разгарнулі масавай работы сярод аднаасобнікаў. У раёне няма пікага ўліку здачы збожжа кулакамі і ў выніку апошнія не адвезлі на пункты ні аднаго пуда.

Адна з форм кулацкага супраціўлення—**здача сырога, нядобраякаснага збожжа.**

У сваіх манеўрах, накіраваных на зрыў паставак, кулаччо часта сустракае падтрыманне з боку рэкордсменаў. Ёсць выпадкі, калі раённыя арганізацыі і сельсоветы прымушаюць загатоўшчыкаў прымаць яўна дрэннае збожжа вільготнасцю звыш 17 проц., не гледзячы па катэгарычную забарону гэтага. Наводле распараджэння райупаўнаважанага камітэту загатовак па Касцюковіцкім раёне тав. **Дабравольскага,** прыёмачны пункт Загат збожжа прыняў ячмень вільготнасцю ў 20-22 проц.

Трэба прыцягнуць да самай суровай адказнасці гэтых злачынцаў, якія з'яўляюцца простымі дапаможнікамі класавага ворага.

Зусім дрэннае становішча з ўнясеннем **натураплаты МТС.** Гадавы план па натураплаце выкапан толькі на 18,9 проц.

У **Крычаўскім раёне,** напрыклад, кулакі распусцілі чуткі, быццам натураплата пойдзе выключна на харчаванне рабочых МТС. Там былі выпадкі, калі кіраўнікі калгасаў забаранілі возчыкам адвозіць натураплату (старшыня калгаса «Новае Сормава»—**Кацзба,** калгаса «Ленінскія дні» **Кавылка**). 14 калгасаў МТС яшчэ не пачалі здачу натураплаты. Мы тут маем яўна варожы кулацкі манеўр, накіраваны на падрыў арганізацыйнага ўплыву МТС па калгаснаю вытворчасць. Самая рашучая барацьба на віна быць абвешчана гэтым антыдзяржаўным тэндэнцыям. **Дагавор з МТС мае сілу закона.** Партыя і ўрад ні ў якім разе не дапусцяць яго парушэння.

Звяртаючы на сябе ўвагу недапушчальнае адставанне саўгасаў і каапгасаў, 40,3 проц. гадавога плана збожжапаставак—ганебны баланс іх работы. Антыдзяржаўныя, рвацкія тэндэнцыі ў саўгасах яшчэ не зломлены. Кіраўнікі саўгасаў павінны памятаць, што ўся іх прадукцыя належыць дзяржаве, што совецкі ўрад не будзе цацкацца з сабатажнікамі.

Нарастанне тэмпаў збожжаздачы павінна ісці па ўсёй лініі, а не толькі за кошт лепшых МТС калгасаў і раёнаў пры бяздейнасці адстаючых. У кожным раёне, у кожным сельсавеце і калгасе павінна быць абвешчана бязлітасная барацьба спробам сутакоіцца на агульных лічбах, ухіліцца ад задачы выцягвання найбольш слабых звеньняў. Зараз як ніколі патрабуецца выключная гібкасць, выразнае канкрэтнае кіраўніцтва, уменне падцягваць кожны адсталы ўчастак.

Барацьба за захаванне ўраджаю не можа абмежавацца толькі полем або токам. Гутарка ідзе аб тым, каб **захаваць збожжа ад страт на ўсім шляху ад поля да спажыўца.** За апошні час мы мелі рад трывожных сігналаў з месц аб агідным становішчы з ахоўвай збожжа на складах і прыёмачных пунктах. Мы сёння змянчаем матэрыял, які паказвае, што па паасобных загатоўчых пунктах пралез класавы вораг, раскрадваючы дзяржаўную прадукцыю. Поўную адказнасць за захаванне збожжа нясуць раённыя совецкія і партыйныя арганізацыі. Іх абавязак—**мабілізаваць усе сілы для збераж эння прадукцыі, прыцягнуць да гэтай справы шырокую пролетарскую грамадскасць.** Загатоўчыя арганізацыі, на чале з беларускай канторай Загатзбожжа, праявілі злачынную бестурботнасць, не прынялі патрэбных мер, каб падрыхтавацца да сустрэчы збожжа новага ўраджаю. Канторы Загатзбожжа павінны прыняць усе меры, каб забяспечыць выразную бесперабойную прыёмку, хаванне збожжа.

Захаваць збожжа да апошняга зярнятка! Вось баявыя задачы ўсіх нашых арганізацый.

Пастанова сакратарыята ЦК КП(б)Б ад 19 верасня 1933 года

Па заяве начальніка палітаддзела Жлобінскага чыгуначнага раёна

Разгледзеўшы заяву начальніка палітаддзела Жлобінскага чыгуначнага раёна тав. **Валкіна** аб адносінах магілеўскага РК да становішча магілеўскага чыгуначнага вузла і заслухаўшы тлумачэнне магілеўскага РК КП(б)Б тав. **Рэзінскага,** ЦК адзначае, што першыя-ж мерапрыемствы палітаддзела, накіраваныя да паляпшэння становішча магілеўскага чыгуначнага вузла, не сустрэлі з боку магілеўскага РК КП(б)Б рашучага падтрымання. **РК КП(б)Б адмовіўся** ад падмацавання чыгуначнага транспарта работнікамі, і спасылаццем на тое, што ім прымацаваны адказныя работнікі да некаторых участкаў на чыгуначным вузле (прымацаванне, як аказалася на справе, фармальнае), прабаваў лічыць свой удзел у рабоце транспарта вычарпаным. ЦК лічыць, што магілеўскі РК заняў у адносінах палітаддзела палітычна няправільную і непартыйную пазіцыю.

Прымаючы да ведама, што магілеўскі райком сваю памылку прызнаў і вызначыў рад мерапрыемстваў па аказанні практычнай дапамогі палітаддзела ў яго рабоце па аздараўленні становішча магілеўскага чыгуначнага вузла, ЦК абавязвае РК КП(б)Б забяспечыць поўнасцю ажыццяўленне вызначаных мерапрыемстваў, даючы рашучы адпор усім, хто прабуе тармазіць мерапрыемствы палітаддзела, або не аказваць яму садзейнасці.

ЦК даручае аргінструктару ЦК накіраваць у распараджэнне жлобінскага палітаддзела 3 чал. для адказнай партработы.

ЦК звяртае ўвагу ўсіх ГК і РК на неабходнасць аказання ўсямернай дапамогі і падтрымання чыгуначным палітаддзелам у іх рабоце па аздараўленні чыгуначнага транспарта.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

У Менск прыяжджае сакратар КІМ'а тав. Чэмаданаў

СЁННЯ Ў 12 ГАДЗІН ДНЯ ПРЫЯЖДЖАЕ Ў МЕНСК ГЕНЕРАЛЬНЫ САКРАТАР ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТА КОМУНІСТЫЧНАГА ІНТЭРН[illegible] (ЕЛІТА).

ДАЦЬ КРАІНЕ ДОБРАЯКАСНАЕ ІЛЬНАВАЛАКНО

ФАРСАВАЦЬ СУШКУ, АБМАЛОТ І РАСЦІЛ ІЛЬНУ

ЛЁН ЗАСТАЎСЯ НА ПОЛІ

ЧАШНІКІ (Ад нашага спецыяльнага карэспандэнта).

На палёх Чашніцкага раёна дагэтуль стаіць 512 гектараў невыцераблёнага ільну, або 10,7 проц. агульнай плошчы; абмалочана-ж толькі 1794 гектары, або 42 проц. у адносінах да выцераблёнага і са сцеліішчаў падняты ўсяго 48 га. Такія ганебныя паказальнікі па ўборцы і першапачатковай апрацоўцы аспоўнай вядучай культуры.

Лепшы час для расціла—жнівеньскія росныя ночы—упушчан. Не спяшаюцца ў раёне з расцілам ільну і ў верасні.

— «Зіма яшчэ далёка, паспеем», —так разважаюць у калгасах. Ім спачуваюць у сельсоветах, а раённае кіраўніцтва так сама патурае такім тэорыям.

Узяць калгас **«Чырвоная Дуброва»,** Лукамльскага сельсовета. Тут было засеяна 42 гектары ільну. Цераблёнае яшчэ не скончана.

— Так, глуцтва, 2-3 гектары засталося на полі,—гаворыць старшыня калгаса Доўгі і зусім не руціць з уборкай. Абмалот-жа фактычна толькі-толькі распачынаецца—абмалочана ўсяго 2 гектары ільну.

Ці выпадкова такая зацяжка з уборкай і апрацоўкай ільну ў калгасе «Чырвоная Дуброва»? Не, не выпадкова.

Доўгі ў мінулым кулак. Аб гэтым усе ведаюць. Старшынёй-жа калгаса ён застаецца таму, што характар мае гібкі, умее да кожнага падыйсці, мяк кім лістком да кожнага прылажыцца.

Вось і зыходзіць яму беспакарана, што лён гніе, што збожжапастаўкі затрымлівае, што сена поўнасцю не здаў, што да бульбапаставак не прыступаў і асенняю сяўбу правёў усяго на 15 проц.

Доўгі ўмее загаварыць і сельсавецкіх работнікаў і пават раённых прад стаўнікоў.

Так ціха, спакойна жыве ў калгасе, ды яшчэ і на пасадзе старшыні, былы кулак Доўгі.

Засмечанасць раду калгасаў класава-варожымі элементамі—адна з прычын такой злачынна-марудной уборкі і цярпапачатковай апрацоўкі ільну.

Але не толькі ў гэтым прычына. Рад фактаў гаворыць і аб тым, што праца ў калгасах арганізавана дрэнна. У радзе калгасаў усе калгасніцы і калгаснікі працуюць разам, а поспеху ў рабоце няма.

У некаторых-жа калгасах, напрыклад, імя Будзённага (Лукомль), на працу выходзіць толькі 60 проц. працаздольных, а часамі і менш. З гультаямі, прагулышчыкамі і дармаедамі тут ніякай барацьбы не вядзецца. Да і ніхто калгасу не дапамог правільна арганізаваць сілы.

З раёна ў сельсоветы і калгасы ездзіць шмат людзей, але выразнасці, гаспадарлівасці ў кіраўніцтве няма.

Прывядзем такі прыклад. Ішлі дажджы. Каб сяк-так ратаваць лён, з раёна далі дырэктыву: «Вазіць лён з поля пад навеці, там падсушваць». Гэта зусім правільна.

Але праз пару дзён было працяжнае сухое надвор'е. Трэба было перасушыць на дварэ звезены лён. Дык не, да гэтага кіраўнікі з раёна не дадумаліся (на прызнанні самога старшыні РВК Папка). Зноў пашоў дождж і, такім чынам, зноў абмалот ільну зацягваецца.

Да гэтага трэба дадаць, што ільнапасальныя машыны Гільштэйна (іх у раёне 15) **амаль зусім не скарыстоўваюцца.** Машынамі «Эддзі» можна малаціць толькі добра прасушаны лён. Ніхто сур'ёзна ў раёне не думае аб поўным скарыстанні гэтых вельмі прадукцыйных машын Гільштэйна. Кулацкія, антымеханізатарскія тэндэнцыі не разбіваюцца, канкрэтныя іх посьбіты не пакараны...

Няма барацьбы за якасць ільну і на сцеліішчы.

У калгасе «Чырвоны ўсход» узялі частку трасты і звозяць з поля. Што-ж гэта за траста—ніхто не пацікавіўся. А гэта не траста, а ільнасаломка, бо яна не вылежалася, нават зялёнага колера на белы не змяніла.

Чаму-ж не сталі падымаць? А таму, што частка ільну ўжо ламаецца, проста крышыцца. Крышыцца-ж не ад таго, што пераляжала, а таму, што яшчэ на ніве лён, звязаны ў буйныя снапы, напрэў, пагніў у сярэдзіне. Пры расціле сартаванне ільну не рабілася, здаровы ад гнілога, буйны ад дробнага—не адбіраўся,—вось таму і выпла, што частка крышыцца, а большасць ільну недалежала.

На сцеліішчах, дзе, як гаворыць, лён расце другі раз,—няма ільнага, вопытнага вока. Гэта наносіць вялікія страты, нагарнаецца якасць валакна.

І, нарэшце, раён не рыхтуецца да ручной пераапрацоўкі ільну. Старшыня РВК тав. Папок заяўляе, што ў райсаўгасе ёсць дакладны ўлік мялак, сушыльняў і т. д., а намеснік загадчыка райзаа **Шабека** цэлую гадзіну перакідваў вялікую кучу папярак і ніяк не мог знайсці гэтых даных.

Нарэшце ён заявіў:

— Даныя ўсе ў райаграпома, а райаграпом паехаў у Лазукі,—словам, шукай у полі ветра.

А. Мікуцкі.

РУКА ВОРАГА КІРУЕ АБМАЛОТАМ

СІРОЦІНА. (Наш кар.).

Калгасы Мішнявіцкага сельсовета імя 1-га мая і «Новая Барсучына» паказваюць вельмі дабрыя прыклады барацьбы за лён. Першы калгас даўно ўбраў увесь лён (18 га), абмалаціў і разаслаў яго. Другі заканчвае абмалот і расціл 70 га. Непасрадна з-пад малатарні «Эддзі» абмалочаныя снапы адвозяць для расцілу. Уся работа ідзе непарыўным канвеерам.

Але гэтыя толькі асобныя поспехі на агульным фоне адставання раёна. Сіроцінічына знаходзіцца на адным з апошніх месц па цераблённі ільна, не гаворачы ўжо аб велізарным разрыве паміж уборкай, абмалотам і расцілам. На 15-е верасня ўбрана ільна каля 82,3 проц.

Яшчэ цяпер у калгасах не ліквідавана старая дзедаўская практыка абразання галовак ільна нажамі і касамі. У калгасе «Новы свет», Мішнявіцкага сельсовета, галоўкі ільна з 2 га абразалі касамі. Тут дзеяннямі кіраўнікоў калгаса кіруе рука класавага ворага. 11 жніўня было выключна спрыяльнае надвор'е. Усе хаты калгаснікаў—на замку. Здаецца, добра, усе пайшлі на работу. Аказваецца, усе калгаснікі паехалі на кірмаш у Мішнявічах. На полі-ж стаяў выцераблены лён.

У калгасе імя Энгельса, Каз'янскага сельсовета, таксама абрэзалі нажамі лён з двух га. Гэты-ж метад ужылі калгасы імя Будзённага і «2-я пяцігодка».

Некалькі дзён назад раённыя работнікі і кіраўнікі калгасаў апрацоўвалі дрэннае становішча з уборкай тым, што ідуць дажджы. «Вось, калі наступіць добрае надвор'е, тады пабачыце!». Ужо чацверты дзень стаіць сонечная нагода. Лён высах, аж трашчыць, толькі малаціць яго. І вось тыя людзі, якія так прагна чакалі сонца, зараз яшчэ не ўзварушыліся. Яркі прыклад — калгас **«Новая справа».** Там 8 верасня ўстанавілі малатарню «Эддзі». Старшыня калгаса т. **Шарыкаў** запэўніў усіх: «Хутка будзе ўстаноўлена».

Прайшло 5 дзён. Можна было абмалаціць добрую палову, а ў калгасе ўсё яшчэ ўстанаўліваюць машыну.. То пас скідаецца з ролікаў, то пастромкі рвуцца. Адным словам, абмалот—на мёртвым пункце.

Магчымасці, якія ёсць у раёне для паспяховага абмалота і расціла ільна не выкарыстаны. 7 машын Гільштэйна да гэтуль стаяць на складзе МТС. 13 завезена ў калгасы. А дзе яны працуюць? Дырэктар МТС Сінічкін на гэта пытанне адказаць не можа.

Х. БАР.

Пераходныя сцягі—Чырвона-Слабодскаму і Сенненскаму раёнам

Цэнтральная камісія па спаборніцтву з Заходняй вобласцю пастанавіла:

1. Пераходны сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР па групе збожжавых раёнаў здабраць ад **ВЕТКАЎСКАГА** раёну і перадаць **ЧЫРВОНА-СЛАБОДСКАМУ** раёну. Кандыдатамі, якія аспрэчваюць пераходны сцяг у Чырвона-Слабодскага раёна з'яўляюцца **СТАРОБІНСКІ І СЛУЦКІ** раёны.

2. Па групе ільнасадчых раёнаў пераходны сцяг ЦК КП(б)Б і СНК БССР пакінуць за **СЕННЕНСКІМ** раёнам. Грунтоўна аспрэчваюць сцяг **ДРЫСЕНСКІ** і **ПОЛАЦКІ** раёны.

Сенненскі раён закончыў абмалот і расціл ільну

СЯННО. (Па тэлеграфу).

Сенненскі раён закончыў абмалот і расціл ільну. Уся ўвага калгаснікаў і аднаасобнікаў мабілізавана на падрыхтоўку трасты са сцеліішчаў, здачу яе на ільназаводы і ручную пераапрацоўку ільну.

Для ўзмацнення барацьбы за якасць ільнавалакна па ўсіх сельсоветах праводзяцца курсы сушыльшчыкаў, мяльшчыкаў і трапальшчыц. У самым Сянно праводзяцца курсы па ільну для кіруючага раённага актыва.

Аб давядзенні сустрэчных планаў у вёсцы Сівіцкай, Лёзнянскага раёна

Пастанова ЦК КП(б)Б

1. Расследваннем устаноўлена, што Касцеёўскі сельсавет пры давядзенні плана хлебаздачы вясной г. г па ўсім сельсавеце заведама ведаючы, што гэты план вышэй фактычна пасеянага зялёнага ільну па сельсавету і ў прыватнасці па в. Сівіцкай на 100 з лішкам га,ўсё-ж гэты план давёў, падзяліўшы лішак прапарцыянальна пасеву паміж усімі дварамі.

2. Гэта простае парушэнне дырэктыў партыі і ўраду аб недапусцімасці сустрэчных планаў было скарыстана класавымі ворагамі для агітацыі супроць здачы збожжа дзяржаве. У выніку выканання жнівеньскага плану па вёсцы Сівіцкай было сарвана, прычым ні мясцовай партарганізацыяй, ні райкомам не былі прыняты неадкладныя меры для масавай растлумачальнай работы сярод насельніцтва в. Сівіцкай і выпраўлення дапушчанай грубай палітычнай памылкі.

ЦК КП(б)Б пастанаўляе:

1. Старшыню Касцеёўскага сельсавета **КАЗЛОВА** з работы зняць, з партыі выключыць і аддаць пад суд за давядзенне сустрэчных планаў па збожжаздачы. Зняць з работы з абвяшчэннем суровай вымовы сакратара партячэйкі тав. **АНЦІПАВА.** Абвясціць суровую вымову з папярэджаннем заг. райзо т. **НЭЙМАН.**

2. У сувязі з тым, што рад матэрыялаў паказвае аб простай вікаватасці ў гэтай справе і райупаўкамзага СНК т. Янкелевіча — пытанне аб ім вырашыць дадаткова.

3. Даручыць пракуратуры рэспублікі праверыць правільнасць давядзення плана збожжаздачы па ўсім раёне і аб выніках далажыць бюро ЦК на пазней 1-га кастрычніка.

4. Указаць Лёзнянскаму РК КП(б)Б на тое, што ім не былі прыняты своечасовыя меры па выпраўленні паказаных незаконных дзеянняў Касцеёўскім сельсаветам і правядзенні растлумачальнай масавай работы сярод насельніцтва вёскі Сівіцкай.

ЦК папярэджвае Лёзнянскі райком КП(б)Б, што калі будзе ўстаноўлена такое-ж становішча, як і ў вёсцы Сівіцкай з давядзеннем сустрэчных планаў, дык у адносінах кіраўніцтва раёна з боку ЦК будуць прыняты больш жорсткія меры партыйнага спагнання.

Сакратар ЦК КП(б)Б — ГІКАЛО.

КАРОВУ У ПЕРШУЮ ЧАРГУ ЎДАРНІКУ

ОРША, 17. (Наш кар.).

Роўна два тыдні таму назад аршанскі РК і РВК вынеслі пастанову, у якой намецілі рад практычных мерапрыемстваў па выкананні пастановы ЦК «аб дапамозе бескароўным калгаснікам у набыцці кароў».

Роўна два тыдні таму назад...

За гэтыя два тыдні райземаддзел закончыў улік бескароўных калгаснікаў. Іх у раёне аказалася 1.200. Мае райза і такія лічбы. У калгасных МТФ ёсць для продажу бескароўным 500 цёлак, а ў калгаснікаў і аднаасобнікаў 324. Такім чынам у раёне (па гэтых даных) не хапае каля 400 цёлак для таго, каб забяспечыць імі ўсіх бескароўных калгаснікаў.

Райземаддзел гэтымі падлікамі не абмежаваўся і выслаў у 25 сельсоветаў сваіх упаўнаважаных, якім дана заданне — да 20 верасня закончыць работу па продажы 500 цёлак з абавулеча стада, выявіць у каго з калгаснікаў і аднаасобнікаў ёсць памянёныя 324 цёлкі і на якіх умовах яны згодны прадаць гэтых цёлак.

Такія весткі можна атрымаць у райземаддзеле. А што робіцца на мясцох?

Праўленне калгаса **«Пролетарый»,** Р.-Сялецкага сельсовета, дало заяўку ў сельсавет на забеспячэнне цёлкамі дзесяці калгаснікаў.

Хто-ж увайшоў у гэты спіс? Ударнікі, беднякі, удовы, што ніколі не мелі магчымасці набыць сабе каровы?

Не. Праўленне калгаса запісала ў гэты спіс ўсіх тых, хто на цёпершні дзень не мае кароў. А чаму не мае (можа прадаў перад ўступленнем у калгас, можа баяўся абагаўрыла гэтага спіса, як і пастанову ЦК, ні на агульным сходзе калгаснікаў, ні ў брыгадах. У рэзультаце ў спіс поршачаргоўнага забеспячэння каровамі трапілі людыры. Напрыклад, Віслаўхаў Кастусь. Ён ужо будучы ў калгасе прадаў сваю карову. У яго сям'я з 3 дзяцей (2 працаздольных), але ўсе яны гультаі, нічога не робяць у калгасе.

Невыпадкова калгаснікі «Пролетарыя» нездаволены, што праўленне калгаса на чале са старшынёй **Калінёўскім,** скарыстоўвае пастановы партыі для дапамогі людырам.

Не лепш справа з забеспячэннем бескароўных калгаснікаў цёлкамі і на Смалянскім сельсавеце. Тут таксама ёсць улік бескароўных, ёсць нават індывідуальныя дагавары паміж калгаснікамі і аддзяленнем «Саюзмеханбанка», але няма належнай грамадскай думкі вакол гэтай справы, няма персанальнага ўліку бескароўных калгаснікаў. Усё гэта робіцца ў кабінетах, фармальна.

Трэба, каб падобная практыка была неадкладна спынена, каб работа па рэалізацыі пастановы ЦК і СНК праводзілася пры актыўным удзеле шырокіх мас калгаснікаў, маючы на ўвазе, што ў першую чаргу карову павінен атрымаць ударнік.

В. Д.

Усебеларуская чырвоная дошка

„Социялістычнае спаборніцтва гаворыць: Дапамагай адстаўшым, дагоняй лепшых — дабіся агульнага ўздыма"

(СТАЛІН)

Па прадстаўленні Барысаўскага РК КП(б)Б і прэзідыума РВК заносіцца на ўсебеларускую чырвоную дошку: БЫТЧАНСКІ СЕЛЬСОВЕТ, Барысаўскага раёна.

Бытчанскі сельсавет па-большэвіцку змагаецца за выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных кампаній

Да 1-га верасня сельсавет поўнасцю выканаў гадавы план пастаўкі збожжа, уборку і звозку ўсіх збожжавых як азімых, так і яравых. Увесь лён убран, абмалочан і разасланы.

План сяўбы азімых на 10 верасня сельсоветам выканан на 85 проц. Сельсавет змагаецца за стварэнне кармовай базы для жывёлагадоўлі. Калгасы поўнасцю выканалі гадавы план сіласавання. Зараз разгортваецца сіласаванне і ў аднаасобным сектары. Па-ўдарнаму змагаецца сельсавет і з бездарожжам. План дарожнага будаўніцтва выканан на 105 проц.

На працадзень па ўсіх калгасах сельсавета ў сярэднім прыпадае: збожжавых **4 кгр.,** бульбы **12 кгр.,** кармоў **3 з пал. кгр.,** і гародніны **3 кгр.**

Лепшыя ўдарнікі сельсавета: т. т. **Янкаў**—брыгадзір калгаса «Большэвік», **Самцоў** і **Дымнавец,** члены сельсавета і **Раяк**—старшыня сельсавета.

***

Па прадстаўленні палітаддзела Рагачоўскай МТС заносіцца на ўсебеларускую чырвоную дошку:

Калгас **„Праўда",** Ціхініцкага сельсавета, Рагачоўскага р-на

Калгас поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па збожжапастаўках. На пункт Загатзбожжа дастаўлена 85,2 цэнтн. добраякаснага збожжа. Поўнасцю выканан таксама і план натураплаты МТС за работу

Уборку ўраджаю калгас правёў узорна, добра арганізаваўшы барацьбу са стратамі. 70 га жыта было ўбрана за 6,5 дня, 31 га аўса за 3 дні, 10 га ільну за 2,5 дня і г. д.

На 15 верасня калгас поўнасцю выканаў план асенняй сяўбы. Пшаніца засеяна на лепшай глебе

На працадзень кожны калгаснік атрымае 5 кгр. збожжа і 15 кгр. бульбы

Дзякуючы ўзорнаму вядзенню гаспадаркі і актыўнай рабоце старшыні калгаса тав. **Песіна** сярод аднаасобнікаў нядаўна ў калгас уступіла 5 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак

Чэрыкаў выканаў план сяўбы азімых

ЦК КП(б)Б—т. Гікало, СНК—т. Галадзеду. Наркамзем—т. Бенеку, „Звяздзе"

ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ЦК КП(б)Б ЧЭРЫКАЎСКІ РАЁН 18 ВЕРАСНЯ ВЫКАНАЎ ПЛАН СЯЎБЫ АЗІМЫХ НА 100,7 ПРОЦ. КАЛГАСЫ ЗАСЕЯЛІ 12.700 ГА ЖЫТА — 100 ПРОЦ. ЗАДАННЯ, АДНААСОБНІКІ — 2.147 ГА—105,6 ПРОЦ. ПЛАН СЯЎБЫ ПШАНІЦЫ ВЫКАНАН ПОЎНАСЦЮ.

У РАЁНЕ РАЗГАРНУЛАСЯ МАСАВАЯ ЎБОРКА БУЛЬБЫ І ЗЯБЛІВАЕ ВОРЫВА.

ВЯДЗЕМ БАРАЦЬБУ ЗА ХУТЧЭЙШАЕ СКАНЧЭННЕ ЎСІХ АСЕННІХ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫХ РАБОТ.

САКРАТАР РАЙКОМА КАЦ.
СТАРШЫНЯ РВК РАТАЙКА.

Соцспаборніцтва з Зах. вобласцю на датэрміновае выкананне фінплана

ЧАМУ ва ЎВАРАВІЧАХ ЗРЫВАЕЦЦА ВЫКАНАННЕ ФІНПЛАНА

УВАРАВІЧЫ. (Наш. кар.).

Раён з квартала ў квартал зрывае планы мабілізацыі сродкаў як па абавязковых, так і па добраахвотных пляцяжах. У апошні час раён занесен на чорную дошку зрыўшчыкаў фінплана, а раённае кіраўніцтва — сакратар РК КП(б)Б **Фрыдман** і старшыня РВК **Краленка** атрымалі партспагнанні ад ЦК КП(б)Б.

Здавалася-б, што раённае кіраўніцтва, маючы такі ўрок, павінна было зрабіць рашучы пералом у выкананні фінплана.

Гэтага, аднак, не зроблена. План па мабілізацыі сродкаў III квартала, як і раней зрываецца. Самаабкладанне выканана на 10-е жніўня толькі на 25,2 проц., страхоўка на 20,2 процантаў, рэалізацыя пазыкі 2-й пяцігодкі — на 29,2 проц. Не лепш становішча і па спажывецкай кааперацыі, якая план тавараазвароту выканала на 50,8 проц., а палпакапленне — на 11,5 проц. І гэта ў той час, калі ў крамах ёсць па 240 тыс. руб. замарожаных тавараў.

Такое становішча можна вытлумачыць толькі поўнай бяздзейнасцю раённага кіраўніцтва ў справе мабілізацыі сродкаў, патраннем з іх боку зрыўшчыкам гэтай важнейшай справы.

У раёне спачатку гэтага года няма загадчыка райфа. Абавязкі загадчыка ўвесь час «пясе» сам старшыня РВК — Караленка. Нясучы абавязкі ён зусім не ўдзяляе ніякай увагі рабоце райфа, будучы перагружан сваёй непасрэднай работай.

Не гледзячы на гэта, аднак, ні РК, ні РВК палец аб палец не ўдарылі для таго, каб умацаваць райфа адпаведнымі работнікамі.

У апошні час НКФ БССР зліквідаваўся і прыслаў загадчыка райфа, тав. **Буракова.** Але апошні, паехаўшы быццам за сям'ёй, прыслаў дакладную запіску, у якой паведамляе, каб яго загадчыкам райфа не лічылі, бо ён «у раён больш не прыедзе». Такім чынам раён ізноў застаецца без загадчыка райфа.

Не лепшае становішча і з апаратам райшчадкасы. За 1933 год змяніліся 3 загадчыкі райшчадкасы, але работа не нікольі не палепшылася.

Райком, аднак, далей за вынясенне пматлікіх рэзалюцый у справе паладжвання работы ашчадкасы не пашоў. Зразумела, рэзалюцыямі планаў мабілізацыі сродкаў не выканаеш, справа не ў рэзалюцыях, а ў людзях і ў кіраўніцтве работай гэтых людзей. Гэтага ў раёне няма.

Безадказнасць у рабоце раённых фінансавых органаў апартуністычны самацёк дае поўную магчымасць сельсоветам сабатаваць мабілізацыю сродкаў.

Інакш нельга вытлумачыць таго, што **Уваравіцкі, Целяшоўскі, Бярвенаўскі, Борахаўскі і Вольскі** сельсоветы дагэтуль не сабралі ні капейкі на самаабкладанні. Борахаўскі сельсавет не спагнаў ні капейкі таксама і па страхоўцы. Правальвае мабілізацыю сродкаў і **Чабатовіцкі** сельсавет, сакратар якога нават згубіў кантарыс.

З рэалізацыяй пазыкі 2-й пяцігодкі справа не лепш. Замест 8-12 тыс. руб. задання рэалізавана пазыкі ў гэтых сельсоветах па 80—400 рублёў.

Партыйныя ячэйкі, камсамол, прафсаюзныя арганізацыі стаяць у баку ад мабілізацыі сродкаў. Выкананне фінплана яны лічаць зусім не сваёй справай. Некаторыя старшыні сельскіх советаў замест арганізацыі работы па выкананню фінплана зрываюць работу.

Напрыклад, старшыня Борахаўскага сельсавета і яго намеснік увесь час п'янствуюць, а планы мабілізацыі сродкаў зрываюцца. Старшыня Целяшоўскага сельсавета **Цімаховіч** займаецца паляваннем і не зварочае ніякай увагі на тое, што сельсавет увесь час на апошнім месцы на мабілізацыі сродкаў і іншых гаспадарча-палітычных кампаніях.

У большасці сельсоветаў зусім няма намеснікаў старшынь, адказваючых за фінансавую работу. Гэта работа даручаецца рахункаводам і сакратарам. Падборам работнікаў для сельсоветаў раённае кіраўніцтва не займаецца. Сакратары сельсавета і асабліва рахункаводы бяруцца проста з вуліцы.

Наркамфін пазбавіў раён крэдытавання, забараніў банку выдаваць грошы з прычыны невыканання плана мабілізацыі сродкаў. Але раённыя работнікі ашукалі НКФ. Паведаміўшы, апошняму, што прымуць усе меры да поўнага выканання планаў, яны, між тым, ніякіх мер да канкрэтнай рэалізацыі свайго абяцання не прынялі і справа застаецца па-ранейшаму.

Раён мае ўсе магчымасці быць перадавым у справе мабілізацыі сродкаў і гэта магчымасць павінна быць ажыццёўлена.

А. Казіміраў.

Вывучым вопыт перабудовы вясковых партарганізацый

(Да куставых партнарад)

Пабольш рознастайнасці ў практычным вопыце і пабольш вывучэння яго (ЛЕНІН).

Сакратарыят ЦК КП(б)Б пастанавіў з 28 па 6 верасня правесці куставы нарады загадчыкаў аргаддзелаў ГК і РК КП(б)Б, нам. гал. палітаддзелаў МТС па партмасавай рабоце і сакратароў ГК ЛКСМБ па пытанні аб падрыхтоўцы першых вынікаў перабудовы вясковай партарганізацыі на аснове пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15 чэрвеня.

Паспяховая неабходнасць і выключна вялікае значэнне гэтых нарад зусім відавочны. Перабудова вясковай партарганізацыі ў нашай рэспубліцы пачалася яшчэ ў першых числах жніўня. Такім чынам сваечатку перабудова працягнула больш двух месяцаў. Гэты тэрмін зусім выстарчальны для таго, каб падвесці першыя вынікі таго, як раёны авалелі сваё кіраўніцтва пастановай, аперацыйным і канкрэтным, як набудаваныя на вытворчым прынцыпе партарганізацыі па-баявому змагаюцца і заклікаюцца за большэвіцкія калгасы і замоцнае жыццё калгаснікаў.

За гэты кароткі тэрмін (2 месяцы) мы ўжо ў большасці раёнаў (толькі 4 раёна яшчэ не пачалі перабудовы) побач з фармальнай перабудовай у радзе месц маем шмат станоў чага вопыта партработы: правільную расстаноўку партыйна-комсамольскіх сіл, сістэматычнае ўмацаванне калгасаў комуністамі за кошт перакідкі іх з гарадоў, сельсавета і г. д., арганізацыю сістэматычнай работы з калгасным актывам, арганізацыю масавапалітычнай работы ў брыгадах і звеннях, соцспаборніцтва і ўдарніцтва, палажэнне парткіраўніцтва камсамолам і г. д.

Створаныя на ідэі тав. **Сталіна** палітаддзелы МТС і совгасаў закліканы ажыццявіць на практыцы пастанову студзеньскага пленума ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб умацаванні калгасаў і ўздыме сельскай гаспадаркі. Палітаддзелы адыгралі рашаючую ролю ў тых вялізарных перамогах, якія атрымала соцыялістычнае земляробства за апошні год. Дзякуючы палітаддзелам магчыма было паставіць пытанне аб стварэнні вытворчых ячэек у вёсцы.

Галоўнай задачай падыходзячых нарад і з'язджэнняў, па-першае, абагульніць увесь накоплены лепшы вопыт партработы, перанесці гэты вопыт на ўсе арганізацыі КП(б)Б, каб на аснове гэтага рэзка ўзняць партработу ў вёсцы на вышэйшую ступень і забяспечыць паспяховае выкананне гаспадарча-палітычных задач, што стаяць перад намі ў вёсцы і заваяванню першынства соцспаборніцтве з Заходняй вобласцю.

Я. Ф. Вайнштэйн.

Лагойскі РК не выконвае пастановы партыі аб дапамозе палітаддзелам

ЦК УсеКП(б) у сваёй пастанове ад 15 жніўня ўказаў на неабходнасць аказання ўсямернай дапамогі палітаддзелам з боку райкомаў.

Як ажыццяўляецца гэта пастанова Лагойскім райкомам КП(б)Б? Лагойскі РК за час існавання палітаддзела не даў у яго распараджэнне для пастаянай работы ні аднаго чалавека.

Палітаддзел Лагойскай МТС у далейшым разгортванні партыйнай і масавай палітычнай работы ўпіраецца ў вострым недахваце людзей. З паяўных 6 парткомсамольскіх ідраў толькі ў 3-х кіраўнікі адпавядаюць свайму прызначэнню. Астатнія лічацца намінальна, ніякай работы на сутнасці не вядуць і не могуць весці з прычыны сваёй палітычнай непадрыхтаванасці. Тое самае можна сказаць і ў адносінах некаторых парторгаў.

У 5-ці калгасах МТС парторгі зусім адсутнічаюць. Няма сакратара адной калгаснай ячэйкі з паяўных 2. Вострая патрэба адчуваецца ў старшынях калгасаў, загадчыках вытворчых участкаў.

Не гледзячы на такое становішча, сакратар райкома гаворыць адно: «У мяне няма людзей». А на самой справе не так. Комуніст Нотрушейко, вызвалены ад работы ў сельспажыўтаварыстве, паслан старшынёю калгаса па-за зонай дзейнасці МТС, не глядзячы на тое, што тав. Нотрушейко настойліва прасіў пасласць яго ў распараджэнне палітаддзела. Былы старшыня сельспажыўтаварыства тав. **Верхаводзька** накіраван таксама ў сельсавет, які не абслугоўваецца МТС. Па настойванні палітаддзела, РК КСМ вылучыў комсамольца для работы ў якасці старшыні рабочкома МТС, а РК КП(б)Б паслаў яго на другую работу. Можна было-б прывесці яшчэ цэлы рад фактаў, калі мелася поўная магчымасць аказаць дапамогу палітаддзелу, але гэта не рабілася.

У распараджэнні РК ёсць раённы актыў, які амаль поўнасцю выкарыстоўваецца для работы ў калгасах не МТС. А для аднаго з сельсветаў МТС не знайшлося куставога партарганізатара. Вылучаныя з тэрытарыяльных ячэек партарганізатары ідпарушуць работу ў калгасах, аднак РК ці лічыць патрэбным праверыць іх работу.

Як відаць з усяго, справа не ў адсутнасці людзей, а ў нежаданні РК аказаць сапраўдную дапамогу палітаддзелу, як гэтага патрабуе партыя. Трэба прымусіць Лагойскі РК выканаць пастановы партыі.

Нач. палітаддзела Лагойскай МТС НОРЬК.

Здабыты торф ператварыць у добраякасны апал

5-та верасня, на месяц пазней планавага тэрміна, на тарфяных балотах Беларусі спыніліся работы па торфаздабычы. Прадаўжэнне сезона на цэлы месяц была выклікана ганебным адставаннем тарфяной прамысловасці ў выкананні сваёй вытворчай праграмы. Нашкодкі глыбока было гэта адставанне сведчыць той факт, што нават прапрацаваўшы лішні месяц амаль усе заводы Белторфу за выключэннем «Закрашынскага імха» сезонных планаў не выканалі. **Асінторф, напрыклад, спыніў здабычу, даўшы 60,3 проц. сваёй сезоннай праграмы, «Бальшавік»—79 проц., імя Першага Мая — 52,8 проц., «Чырвоная Беларусь» —64,8 проц., «Смалявічы» — 54,5 проц., імя Даўмана — 74,6 проц., «Свабода» — 83,3 проц. і «Чырвоны сцяг» — 91,8 проц. Па ўсёй сістэме ў цэлым сезонны план выканан толькі на 68,5 проц.** Трэба было здабыць 492 тысяч тон, а здабыта 337 тысяч. Такім чынам, ад адпаўнення толькі сістэмы Белторфу, якая яднае 9 буйнейшых заводаў, краіна не даатрымала 158 тыс. тон тарфянога апала.

Вынікі выканання праграмы торфаздабычы на іншых сістэмах таксама незадавальняючыя. Па Наркамлёгпраму, напрыклад, толькі два заводы — **«Звязда» і «Чырвоны тарфянік»** паспяхова завяршылі торфаздабычу, а астатнія чатыры выканалі свае сезонныя планы ад 55 да 88 проц. Па Наркамлёгпраму ў цэлым сезонная праграма выканана ўсяго на 76,8 проц.

З зусім ганебнымі лічбамі скончыла сезон тарфяная прамкааперацыя. **Сваю вытворчую праграму яна выканала толькі на 36,3 проц., не дадаўшы краіне 260 тыс. тон.**

Такавы вынікі работы тарфяной прамысловасці Беларусі ў часці торфаздабычы. Аднак, як відома, адна толькі здабыча яшчэ далёка не дае поўнага малюнку выканання плана. **Дабыты торф — гэта яшчэ не апал. Топкам электрастанцыі патрэбен не наспуп торф, а торф добра высушаны, які трымае ў сябе не больш 30 проц. вільготнасці.** Толькі такі торф можа быць добрым «энергетычным хлебам» электрастанцый, якія ў сваю чаргу будуць бесперабойна харчаваць электраэнергіяй маторы шматлікіх разнастайных варштатаў нашай прамысловасці.

Вось чаму сушка торфу ў шмат разоў адказнейшы працэс работы, чым сама здабыча. Гэтым працэсам у апошнім вызначаецца якасць усёй работы завода. А як абстаіць справа з сушкай торфу? Вельмі і вельмі дрэнна. Возьмем тую самую сістэму Белторфу. Як была паказана вышэй, гэта сістэма за сезон здабыла 337 тыс. тон торфа. Асноўную масу яго—314 тыс. тон, складае кавалкавы торф, які пасля здабычы павінен абавязкова прайсці працэс сушкі. З гэтых 314 тыс. тон высушана і складае на ў штабелі на 10 верасня толькі 121 тыс. тон, або 38,5 проц. І гэта ў той час, калі самая лепшая частка сезону ў сэнсе сушкі прайшла. **Паводле планавага тэрміну на 10 верасня ў расціле павінна быць не больш 16 з паловай тыс. тон, фактычна-ж на гэта чысло знаходзіцца ў расціле 74 тыс. тон.**

Чаму атрымалася такая велізарная разбежка паміж здабычай і сушкай? Кіраўнікі многіх заводаў, ды і самага Белторфу тлумачаць гэта выключна дрэнным падвор'ем. Ці так гэта на самай справе? Не, не так. Слоў няма, дажджы пэўную ролю ў стварэнні некаторых цяжкасцей адыгралі. Але гэтыя цяжкасці абавязваюць кіраўнікоў прыняць рашучыя меры для іх пераманання, узяць сушку пад штодзённы кантроль. На справе-ж уся работа па сушцы драхоцяць самацёкам.

Нармальны час знаходжання торфу ў расціле пасля здабычы — 10-11 дзён, а ён, як правіла, на большасці заводаў ляжыць 20-25 дзён, а то і поўны месяц. Тлумачыцца гэта не столькі дрэнным падвор'ем, колькі дрэннай арганізацыяй самой работы. На многіх заводах зусім ігнаруюцца такія формы сушкі, як складанне больш менш зацвярдзелых цаглін торфу ў так званыя «пяткі» і «змейкі», знаходзячыся ў якіх торф хутчэй падпадае дзейнічанню паветра і гэтым самым працэс сушкі значна скарачаецца.

Асноўная ўвага зараз у працэсе сушкі павінна быць накіравана на хутчэйшае падняцце торфу з расціле. Калі за знаходзячымся ў расціле торфам не будзе дастатковага догляду, **сваячасовага паварачвання, складання ў «пяткі» і «змейкі»**, то пад уплывам атмасферных ападкаў ён можа раскіснуць, страціць форму цаглін і прысці ў непрыгоднасць.

Правільная штабелёўка ўжо высушанага торфу мае велізарнае значэнне ў справе захавання яго добраякаснасці. Па-першае, у штабелі можа складацца толькі той торф, вільготнасць якога ў працэсе сушкі дасягнула да 30-40 проц., па-другое самі штабелі павінны складацца так, каб торф мог паддавацца дзейнічанню паветра і такім чынам яшчэ больш зменшаць сваю вільготнасць, і, па-трэцяе, штабелі павінны быць добра пакрытыя, каб у сярэдзіну не пападалі атмасферныя ападкі і гэтым самым не павялічвалі-б вільготнасць торфу.

Усе гэтыя патрабаванні самі па сабе вельмі простыя і ажыццяўленне іх не патрабуе асаблівых намаганняў, а карысць яны можуць даць вялікую. Тым не менш іх забываюць і рэдка дзе ўжываюць, чым па сутнасці не даацэньваецца ўся важнасць барацьбы за добраякаснасць апалу.

Час для сушкі застаўся вельмі абмежаваны. Да першага кастрычніка ідводзіцца на высушванай і не складзенай у штабелі на балотах не павінна застацца. Гэта патрабуе ад кіраўнікоў заводаў, Белторфу, Белпрамторфсаюзу і Наркамлёгпраму ўзмацнення сваёй увагі да сушкі.

Працэс сушкі праводзіцца выключна ручным спосабам. Адгэтуль задача поўнага забяспечання сушыльных работ рабочай сілай. Той колькасці рабочых, якая зараз ёсць на заводах, далёка не выстарчальна, каб у тэрмін закончыць сушку. **На Асінторфе, напрыклад, дзе сушка асабліва зацягнулася, не хапае больш 700 рабочых.** Кіраўніцтва гэтага заводу па сканчэнні здабычы не змагло пераключыць тарфяжкаў з іншых работ на сушку. І яны амаль усе раз'ехаліся.

Для таго, каб забяспечыць сушку неабходнай колькасцю рабочай сілы, СНК і ЦК КП(б)Б спецыяльнай дырэктывай абавязалі старшынь раёвыканкомаў і сакратароў РК правесці неабходныя мерапрыемствы па аказанні торфазаводам практычнай дапамогі ў вярбоўцы калгаснікаў, асабліва жанчын. Кожнаму раёну дана кантрольная лічба колькасці калгаснікаў, якія павінны быць завярбованы. І трэба сказаць, што ні адзін раён гэтых лічбаў не выканаў. **З Дубровны, напрыклад, замест 200 чалавек, на Асінторф прыбыла толькі 87 чалавек, з Оршы замест 150 — 45, з Талачына замест 150 — 53.** З такіх раёнаў як **Быхаў, Прапойск, Рэчыцы, Спуцан, Асіпавічы, Бабруйск і Пухавічы** да гэтага часу яшчэ ні адзін чалавек на заводы не прыбыў. У гэтых раёнах ніякай работы ў калгасах па вярбоўцы да гэтага часу не праведзена.

Тут у наяўнасці тая-ж самая недаацэнка важнасці пытання, якая праяўлялася з боку асобных РВК і РК у часе здабычы торфу. **З падобнай недаацэнкай трэба раз і назаўсёды пакончыць. Неабходна зразумець, што торф ва ўмовах Беларусі мае велізарнае гаспадарчае значэнне. Таму аднасіцца да яго здабычы і сушкі, як да чыста ведамственнай справы ні ў якім разе нельга.**

Партыя патрабуе ад тарфяной прамысловасці даць краіне неабходную колькасць добрага тарфянога апалу. Але партыя таксама патрабуе і ад усіх раённых арганізацый аказваць гэтай яшчэ маладой, не маючай сваіх пастаянных кадраў галіны прамысловасці, каякрэтную дапамогу ў рабоце, у прыватнасці ў арганізацыі набору рабочай сілы. Гэтыя патрабаванні павінны быць выкананы ва што-б та ні стала.

Толькі пры агульных намаганнях, пры рашучым палепшанні работы саміх торфазаводаў з аднаго боку, і большэвіцкай увазе і дапамозе торфапрамысловасці з боку раённых арганізацый мы зможам дабіцца таго становішча, калі нашы электрастанцыі атрымаюць добраякасны апал і гэтым самым забяспечаць бесперабойную работу ўсёй прамысловасці.

Зараз паміж фабрыкамі і заводамі Беларусі разгортваецца перадкастрычніцкая вытворчая перакліч'ка на рэалізацыі пастановы ліпеньскага аб'яднанага пленума ЦК і ЦКК аб рабоце прамысловасці. Трэба проста сказаць, што гэта ініцыятыва яшчэ не адчуваецца на торфазаводах. І толькі таму, што тарфяныя арганізацыі, пачынаючы ад ЦП саюза тарфянікаў, Белторфу, Белпрамторфсаюзу і канчаючы цырокцыямі, шартягінкамі і торфкомамі заводаў, палец аб палец не ўдарылі, каб разгарнуць вакол перакліч'кі масавую работу сярод рабочых, занятых на сушцы. Надзвычайна ўказанні пленума ЦК і ЦКК аб неадкладнай арганізацыі працы па прадпрыемствах і невыстарчальнай якасці працуючай не датычаць працэса сушкі торфа?

Рабочыя і ІТР прадпрыемстваў металапрацоўчай, дрэвапрацоўчай, швейнай, абутковай, гарбарнай і інш. галін прамысловасці разгортваюць перакліч'ку, узнімаючы сваё вытворчы энтузіязм на яшчэ вышэйшую ступень, з тым каб XVI-ю гадавіну Кастрычніка сустрэць новымі перамогамі. Рабочыя і ІТР торфянай прамысловасці павінны таксама ўключыцца ў гэта важнейшае мерапрыемства, мабілізаваць сябе, сваю актыўнасць на паспяховае сканчэнне сушкі торфа, каб разам з усімі працоўнымі сустрэць прамысловае свята перамогамі на тарфяным фронце.

Р. ФРАЛОЎ.

ЧЫСТКА ПАРТЫІ

ШТО ПАКАЗАЛІ ПЕРШЫЯ ДНІ

15 верасня пачалася чыстка партыйнай ячэйкі беларускага аддзялення Дзяржаўнага банка. Чыстка пачалася пры вузкім невыстарчальным удзеле беспартыйных работнікаў банка і кліентуры. Горш таго, 14 верасня камісіяй на чыстцы быў распушчан першы сход, бо замест 200 чалавек з'явілася толькі 120 і то са спазненнем на дзве гадзіны.

Усё гэта здарылася таму, што адпаведная падрыхтоўчая работа да чысткі не было.

Камісіі па чыстцы першыя два дні сваёй работы прышлося аддаць выключна на падрыхтоўцы і калі намеціўся ёрух, камісія змагла распачаць сваю работу.

На першым пасяджанні ў прысутнасці вялікай колькасці работнікаў банка і кліентаў камісія заслухала даклад сакратара ячэйкі тав. **Мікульскага.** Даклад быў сухі, неканкрэтны. Праўда, тав. Мікульскі гаварыў шмат аб недахопах, але нічога не сказаў аб карэнных недахопах, аб канкрэтных людзях, якія вінаваты ў гэтых недахопах.

— Не умеем працаваць, крэдытны план мы недаацэнілі, — так пачаў тав. Мікульскі свой даклад.

Крэдытны план доўгі час не ўводзіўся. Аперацыйны сектар не прыбудаваў сваёй работы, клієнты, як і раней, працэс шмат часу на атрыманне грошай. Абвілічка, ураўнялаўка ў зарплаце, пеганіна, бюракратызм яшчэ не выкарчаваны ў беларускім Дзяржбанку.

А социялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва? У банку гэтых метадаў работы амаль не было. Соцспаборніцтва паміж групамі і брыгадамі на некаторы час разгортваецца толькі тады, калі складаецца гадавы баланс, або гадавая справаздача. А пасля гэтага зноў усё заціхае. Заціхае да чарговай справаздачы, да чарговага складання гадавога балянса.

Аб усім гэтым гаварыў тав. Мікульскі. Але ён ні слова не сказаў, хто-ж канкрэтна вінават, хто нясе за ўсё адказнасць. Не сказаў, чаму ячэйка так роўнадушна глядзіць на ўсе гэтыя хібы, не прымаючы ніякіх мер да іх ліквідацыі.

У ячэйцы беларускага аддзялення Дзяржбанка налічваецца 22 члена і 1 кандыдат партыі. Пры гэтым 9 чалавек з гэтага партыі. Значыць, зараз праходзіць чыстку 14 чалавек.

Мікульскі ў сваім дакладзе даў на кожнага камуніста характарыстыку. Характарыстыкі гэтыя прыкладна такія: **Бузава** — неактыўная; **Бутневіч** — член партыі з 1919 г., замкнуты чалавек, даручэнні бюро не выконвае; **Брукер** — былы буйдавец, нядолены чалавек, хоць і з вышэйшай адукацыяй. Ён ні карысці, ні шкоды партыі прынесці не можа. Заданні ячэйкі ўзарта не выконвае.

Гаворачы пра кожнага комуніста сваёй ячэйкі, ён не сказаў толькі пра сябе. Не сказаў пра тое, што і ён нічога не зрабіў, каб ячэйка добра працавала.

У спрэчках гаварылі больш канкрэтна. Выступаючыя паказалі тых, хто вінават у прарывах, хто вінават у тым, што ячэйка сарвала партпучобу, што няма сапраўды большэвіцкай самакрытыкі і г. д.

У мінулым годзе беларускае аддзяленне Дзяржбанка запяло першынства па Совецкім Саюзе. Гэты поспех супакоёў кіраўніцтва ячэйкі. Спадзяваліся, што ўсё пойдзе само па сабе — самацёкам.

Выдача заработка рабочым з месяца ў месяц затрымлівалася на віне банка. Аб гэтым заўважыў клієнт тав. **Бертман.** Ён прывёў рад агідных фактаў бюракратызма пры выдачы зарплаты рабочым менскіх заводаў, фабрык і ўстаноў. Апрача таго, кожнае прадпрыемства горада штосіня траціць на некалькі тысяч на адачу ў банк вылучаных грошай. Клієнта Бертмана адзін раз на працягу цэлага дня **Дрэйзін** пасылаў да **Шэхмана**, а Шэхман да Дрэйзіна. І ў выніку гэтай неразбярыхі быў згублен чэк, які ледзь-ледзь быў знойдзен.

Шофэрства рабочых завода «Большэвік» існуе толькі на паперы. Гаварыльня за мяніла сапраўднае шофэрства.

50 проц. усіх работнікаў банка не прымае ўдзела ў грамадскім жыцці. У банку па гэты час не было ні аднаго схода, дзе-б была хоць палова супрацоўнікаў. Мясцком нічога не робіць.

Больш таго, ненатурныя з гэтых парушальнікаў працоўнай дысцыпліны і ў прыватнасці ЧЫЖЭЎСКІ, ГРЫБ замест пакарання атрымалі заахвочанне і нават трапілі ў спіс лепшых ударнікаў.

Накладзенне спагнанняў — гэта толькі пачатак барацьбы за дысцыпліну. Трэба яшчэ зрабіць так, каб на кожным спагнанні выхоўваць вінаватых і ўсю астатнюю масу работнікаў.

Статут прадугледжвае не толькі меры пакарання, але і меры заахвочання—прэміравання, матэрыяльнае і грамадскае заахвочанне, заклясенне на дошку гонару і г. д.

Гэтым самым ствараецца сапраўдная атмасфэра грамадскага давер'я і гонару вакол гераяў працы і атмасфэра абурэння і пагарды вакол подыраў, прагульшчыкаў, вакол усіх злосных парушальнікаў працоўнай дысцыпліны.

Сярод работнікаў службы руху ёсць не мала ўдарнікаў, перадавікоў, якія самааддана змагаюцца за аздараўленне транспарта, за перабудову яго, як гэтага патрабуюць партыя і ўрад. У канторы службы руху мы прабавалі знайсці хоць-бы адзін факт заахвочання, узнагароды лепшых работнікаў. Такіх фактаў, на жаль, мы не знайшлі. Больш таго, у канторы нават няма ні ліку ўзнагарод, а паводле статуту такая кніга абавязкова павінна быць заведзена.

Улік парушэнняў і спагнанняў па працдысцыпліне ў тым выглядзе, у якім ён вядзецца ў канторы (загадчык асабістага стала МАЛЧАН), таксама не адлюстроўвае сапраўднага становішча. Гэты ўлік настолькі заблытан, што там, напрыклад, можна сустрэць двухразовыя запісы за адно і тое-ж парушэнне. Дыспетчару СТАЖКЕВІЧУ два разы запісана вымова за сон на дзяжурстве. Замест яснай матывіроўкі парушэння даецца агульная, часамі анекдатычная ацэнка: «За галаслоўнае паказанне». А пад гэтым «галаслоўным паказаннем» па сутнасці хаваецца простае «очковтирательство».

Вось якое становішча працдысцыпліны на такім важнейшым участку, як служба руху, ад выраэнасці работы якой залежыць асваенне грузапатока збожжа, бульбы і іншых грузаў.

Характэрны поўны спакой, з якім адносяцца кіруючыя работнікі службы руху да ўзмацнення дысцыпліны.

Мы звярнуліся да сакратара партколектыва тав. **МАЙСАКА** з пытаннем, ці ведае ён аб пагражаючым становішчы з працоўнай дысцыплінай.

Ён са здзіўленнем адказаў:— наўжо праўда, а я аб гэтым не ведаю (?!)

Як з працоўнай дысцыплінай па 6 вагонным участку станцыі Менск?

У лістпні тут быў поўны развал. Сямейнасць і кругавая парука ўтойвалі факты прагулаў, п'янства і інш. парушэнні працоўнай дысцыпліны. Жнівень даў 28 парушэнняў, з якіх 5 выпадкаў самавольнага кідання работы, 5 прагуляў, 6 псаванняў абсталявання і г. д.

Новае кіраўніцтва вагоннага ўчастка дабілася поўнага эруху, але і ў верасні ўжо мелі месца 6 прагулаў і адзін выпадак прыходу на работу ў п'яным выглядзе.

Неабходна ліквідаваць нездаровы настрой самасупакоенасці, які ёсць у некаторых таварышоў і асабліва ў нізавым вытворчым звяне, што, мо'ў, у нас усё ідзе добра і ніякіх парушэнняў працоўнай дысцыпліны няма. Той факт, што за палову верасня ўжо было 6 прагулаў, гаворыць аб тым, што патрэбна яшчэ больш рашучая барацьба за павышэнне дысцыпліны.

Начальнік папітаддзела МБВ чыг. тав. **ДАНЕНКА**, выступаючы на агульным сходзе вагоннага, адзначыў, што хоць у рабоце вагоннага дэпо ёсць некаторы эрух, але нагрузка дэпо малая, рабочы дзень выкарыстоўваецца дрэнна, ён не запоўнен, не разгорнута соцспаборніцтва.

Кіраўніцтва вагоннага ўчастка да апошняга часу займалася галоўным чынам фіксацыяй парушэнняў. Лепшыя ўдарнікі не вылучаліся, не ставіліся ў прыклад, не заахвочаліся.

А ці ёсць такія перадавікі ў вагонным дэпо? Бясспрэчна, ёсць. Брыгада **ГАЙДУКЕВІЧА** паказвае ўзоры, як трэба змагацца за выкананне транфінплана, за здаровы вагон, за сялдомыя адносіны да працы. Гэта брыгада—адна з лепшых. Яна выконвае вытворчы заданні на 105 проц. Зусім вама брану і паў торнасці. Вытрымлівацца тэрмін знаходжання вагонаў у рамонце. Узорна працуюць, апрача брыгадзіра Гайдукевіча, т. т. **ШВАБОЎСКІ, ШКРОБА і СІНКО.**

Пасля апублікавання новага статута прайшло звыш 2-х месяцаў, але ў начторы вагоннага участка не маглі прывесці ні аднаго факта заахвочання і толькі цяпер выдзян загад аб прэміяванні брыгады Гайдукевіча.

Сярод парушальнікаў працоўнай дысцыпліны ёсць комуністы і комсамольцы (Пекарэвіч, Шыманскі і інш.).

Комуністы і комсамольцы павінны паказаць узоры дысцыпліванасці і ўдарнай работы. Тав. **ДАНЕНКА** зусім правільна падкрэсліў, што не месца ў партыі і комсамоле зрыўшчыкам працоўнай дысцыпліны.

З усёй настойлівасцю і большэвіцкай непрымірымасцю трэба ўзняцца за правядзенне дысцыпліннага статута, за шырокую папітычна-выхаваўчую работу.

Трэба ўзняць ярасць мас супроць ворагаў пролетарскай дысцыпліны, акружыць іх атмасферай грамадскай пагарды і байкота, мабілізуючы ўвагу шырокіх рабочых мас вакол кожнага канкрэтнага выпадка парушэння дысцыпліны.

Брыгада «Звязды»: М. КІН, В. ВОЛЬФ.

ДЫСЦЫПЛІНАРНЫ СТАТУТ—АСНОВА БОЛЬШЭВІЦКАГА ПАРАДКУ НА ТРАНСПАРЦЕ

Някіх паблажак ворагам пролетарскай дысцыпліны

ЦК УсеКП(б) і СНК СССР у сваіх пастановах аб чыгуначным транспарце асаблівую ўвагу завастраюць на ўзмацненні працоўнай дысцыпліны.

«КАБ ВЫВЕСЦІ ЧЫГУНАЧНЫ ТРАНСПАРТ НА ШЫРОКУЮ ДАРОГУ І ПАКОНЧЫЦЬ З ЯГО НЕДАХОПАМІ, ТРЭБА ЎЗНЯЦЬ У ЯГО ДУХ СВЯДОМАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ І ПРАЦОЎНАГА СПАБОРНІЦТВА, НЕАБХОДНА ПАКОНЧЫЦЬ З РАЗГІЛЬДЗЯЙСТВАМ І РАЗВІЦЬ У КОЖНЫМ РАБОТНІКУ ПАЧУЦЦЁ ВЯЛІЗАРНЕЙШАЙ АДКАЗНАСЦІ ПЕРАД КРАІНАЙ, НЕАБХОДНА ДАБІЦЦА ТАГО, КАБ ЧЫГУНАЧНЫ ТРАНСПАРТ ПРАЦАВАЎ ВЫРАЗНА І БЕЗ ПЕРАБОЯЎ, ЯК ЧАСАВЫ МЕХАНІЗМ».

Неабходнасць гэтага зусім зразумела Чыгунка—найбольш складаны механізм. Малейшае парушэнне работнікамі сваіх абавязкаў, малейшая недакладнасць цягнуць за сабой дэзарганізацыю руху, а вельмі часта эдарэнні і крушэнні.

Таму ўведзены пару месяцаў таму на зад новы дысцыплінарны статут на транспарце патрабуе ад кожнага работчага і служачага свядомага і дакладнага выканання сваіх абавязкаў, бясспрэчнага і хуткага выканання загадаў і распараджэнняў сваіх начальнікаў.

ЦІ ЗРАЗУМЕЛІ ГЭТА НА МЕНСКІМ ВУЗЛЕ?

Перад намі рад фактаў, якія сведчаць, што некаторыя арганізацыі фармальна падыйшлі да рэалізацыі важнейшай дырэктывы партыі і ўрада.

Адказны сакратар МК СЛУЖБЫ РУХУ тав. ХМЕЛЕЎСКІ заяўляе вельмі пераканаўчым голасам:

— Дысцыплінарны статут прапрацавалі на сходах і зменах. Ён даведзен да кожнага рабочага.

Потым менш упэўненым тонам дадае:

— Праўда, многія рабочыя ведаюць толькі аб тых пунктах, дзе гаворыцца аб карных санкцыях.

У далейшым аказваецца, што аптымістычны настрой тав. ХМЕЛЕЎСКАГА наогул не мае пад сабой падстаў.

Працдысцыпліна па службе руху надзвычай слабая. Парушэнні не толькі не змяншаюцца, а павялічваюцца.

Так, калі ў лістпні было 15 парушэнняў, дык у жніўні іх было 35, а за 15 дзён верасня ўжо 60.

Выяўляецца рад фактаў скажэння і дыскрэдытацыі самой ідэі дысцыплінарных спагнанняў.

Па віне саставіцеля цягнікоў ПЛАТОНАВА, сцэпшчыка ГРЫБА і стрэлачнікаў ЮЖЫНА, ЧЫЖЭЎСКАГА і ЯСІНЕНКА 24 жніўня пабіта 10 вагонаў. Замест перадачы справы ў суд, як гэта прадугледжана статутам, начальнік станцыі не выкарыстаў сваіх правоў, прымірыча аднёсся да гэтага абурэння выпадка і абмежаваўся вынясненнем вымовы. А за падобны буксаў ён наогул пічыць непатрэбным накладаць якія-б там ні было дысцыплінарныя спагнанні.

Больш таго, ненатурныя з гэтых парушальнікаў працоўнай дысцыпліны і ў прыватнасці ЧЫЖЭЎСКІ, ГРЫБ замест пакарання атрымалі заахвочанне і нават трапілі ў спіс лепшых ударнікаў.

Накладзенне спагнанняў — гэта толькі пачатак барацьбы за дысцыпліну. Трэба яшчэ зрабіць так, каб на кожным спагнанні выхоўваць вінаватых і ўсю астатнюю масу работнікаў.

Статут прадугледжвае не толькі меры пакарання, але і меры заахвочання—прэміравання, матэрыяльнае і грамадскае заахвочанне, заклясенне на дошку гонару і г. д.

Гэтым самым ствараецца сапраўдная атмасфэра грамадскага давер'я і гонару вакол гераяў працы і атмасфэра абурэння і пагарды вакол подыраў, прагульшчыкаў, вакол усіх злосных парушальнікаў працоўнай дысцыпліны.

Сярод работнікаў службы руху ёсць не мала ўдарнікаў, перадавікоў, якія самааддана змагаюцца за аздараўленне транспарта, за перабудову яго, як гэтага патрабуюць партыя і ўрад. У канторы службы руху мы прабавалі знайсці хоць-бы адзін факт заахвочання, узнагароды лепшых работнікаў. Такіх фактаў, на жаль, мы не знайшлі. Больш таго, у канторы нават няма ні ліку ўзнагарод, а паводле статуту такая кніга абавязкова павінна быць заведзена.

Улік парушэнняў і спагнанняў па працдысцыпліне ў тым выглядзе, у якім ён вядзецца ў канторы (загадчык асабістага стала МАЛЧАН), таксама не адлюстроўвае сапраўднага становішча. Гэты ўлік настолькі заблытан, што там, напрыклад, можна сустрэць двухразовыя запісы за адно і тое-ж парушэнне. Дыспетчару СТАЖКЕВІЧУ два разы запісана вымова за сон на дзяжурстве. Замест яснай матывіроўкі парушэння даецца агульная, часамі анекдатычная ацэнка: «За галаслоўнае паказанне». А пад гэтым «галаслоўным паказаннем» па сутнасці хаваецца простае «очковтирательство».

Вось якое становішча працдысцыпліны на такім важнейшым участку, як служба руху, ад выраэнасці работы якой залежыць асваенне грузапатока збожжа, бульбы і іншых грузаў.

Характэрны поўны спакой, з якім адносяцца кіруючыя работнікі службы руху да ўзмацнення дысцыпліны.

Мы звярнуліся да сакратара партколектыва тав. МАЙСАКА з пытаннем, ці ведае ён аб пагражаючым становішчы з працоўнай дысцыплінай.

Ён са здзіўленнем адказаў:— наўжо праўда, а я аб гэтым не ведаю (?!)

Як з працоўнай дысцыплінай па 6 вагонным участку станцыі Менск?

У лістпні тут быў поўны развал. Сямейнасць і кругавая парука ўтойвалі факты прагулаў, п'янства і інш. парушэнні працоўнай дысцыпліны. Жнівень даў 28 парушэнняў, з якіх 5 выпадкаў самавольнага кідання работы, 5 прагуляў, 6 псаванняў абсталявання і г. д.

Новае кіраўніцтва вагоннага ўчастка дабілася поўнага эруху, але і ў верасні ўжо мелі месца 6 прагулаў і адзін выпадак прыходу на работу ў п'яным выглядзе.

Неабходна ліквідаваць нездаровы настрой самасупакоенасці, які ёсць у некаторых таварышоў і асабліва ў нізавым вытворчым звяне, што, мо'ў, у нас усё ідзе добра і ніякіх парушэнняў працоўнай дысцыпліны няма. Той факт, што за палову верасня ўжо было 6 прагулаў, гаворыць аб тым, што патрэбна яшчэ больш рашучая барацьба за павышэнне дысцыпліны.

Начальнік папітаддзела МБВ чыг. тав. ДАНЕНКА, выступаючы на агульным сходзе вагоннага, адзначыў, што хоць у рабоце вагоннага дэпо ёсць некаторы эрух, але нагрузка дэпо малая, рабочы дзень выкарыстоўваецца дрэнна, ён не запоўнен, не разгорнута соцспаборніцтва.

Кіраўніцтва вагоннага ўчастка да апошняга часу займалася галоўным чынам фіксацыяй парушэнняў. Лепшыя ўдарнікі не вылучаліся, не ставіліся ў прыклад, не заахвочаліся.

А ці ёсць такія перадавікі ў вагонным дэпо? Бясспрэчна, ёсць. Брыгада ГАЙДУКЕВІЧА паказвае ўзоры, як трэба змагацца за выкананне транфінплана, за здаровы вагон, за сялдомыя адносіны да працы. Гэта брыгада—адна з лепшых. Яна выконвае вытворчы заданні на 105 проц. Зусім вама брану і паў торнасці. Вытрымлівацца тэрмін знаходжання вагонаў у рамонце. Узорна працуюць, апрача брыгадзіра Гайдукевіча, т. т. ШВАБОЎСКІ, ШКРОБА і СІНКО.

Пасля апублікавання новага статута прайшло звыш 2-х месяцаў, але ў начторы вагоннага участка не маглі прывесці ні аднаго факта заахвочання і толькі цяпер выдзян загад аб прэміяванні брыгады Гайдукевіча.

Сярод парушальнікаў працоўнай дысцыпліны ёсць комуністы і комсамольцы (Пекарэвіч, Шыманскі і інш.).

Комуністы і комсамольцы павінны паказаць узоры дысцыпліванасці і ўдарнай работы. Тав. ДАНЕНКА зусім правільна падкрэсліў, што не месца ў партыі і комсамоле зрыўшчыкам працоўнай дысцыпліны.

З усёй настойлівасцю і большэвіцкай непрымірымасцю трэба ўзняцца за правядзенне дысцыпліннага статута, за шырокую папітычна-выхаваўчую работу.

Трэба ўзняць ярасць мас супроць ворагаў пролетарскай дысцыпліны, акружыць іх атмасферай грамадскай пагарды і байкота, мабілізуючы ўвагу шырокіх рабочых мас вакол кожнага канкрэтнага выпадка парушэння дысцыпліны.

Брыгада «Звязды»: М. КІН, В. ВОЛЬФ.

М. І. Лісковіч

ЗЛІЦЦЁ ОРГАНАЎ НАРКАМПРАЦЫ З ПРАФСАЮЗАМІ

Прафсаюзныя арганізацыі ўпачынуюць надыйшлі да практычнага выканання функцый органаў Наркампрацы і Сацстраха як у цэнтры, так і на месцах.

У чым палітычны і практычны сэнс аддзіцця Наркампрацы з прафсаюзамі? Гэта злццё ёсць вынік той перабудовы работы, якую правод

ЗБЕРАГЧЫ КОЖНЫ КІЛОГРАМ ЗБОЖЖА АД ПСАВАННЯ І РАСКРАДВАННЯ

Пастанова прэзідыума ЦКК КП(б)Б і калегіі НК РСІ Бел. аб збожжапастаўцы і ахове збожжа

Заслухаўшы даклад групы загатовак аб ходзе выканання плана збожжапастаўкі, стано прыёмкі, ахове і хавання збожжа, прэзідыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ Бел. адзначаюць, што, не глядзячы на рад дапых дырэктыў з боку ЦК, ЦКК і СНК аб своячасовым выкананні плана збожжапаставак, **выкананне плана праходзіць зусім незадавальняюча.** На 10 верасня гадавы план збожжаздачы выкананы на 42,5 проц., з апошняя пяцідзеўка з 5 па 10 верасня замест прыроста дала зніжэнне ў параўнанні з мінулай па 2.133 тоны.

Недапушчальна выконваецца план пастаўкі адпасобным сектарам — 42,1 проц., злачынна выконваюцца збожжапастаўкі кулацкімі гаспадаркамі, выканаўшымі 6,3 проц. Гэта сведчыць аб тым, што радам раёнаў не ўлічваецца кулацкі сабатаж у збожжапастаўках мінулага года.

Праверкай устаноўлена, што ў Бабруйскім сельсавеце, **Віцебскага раёна**, шмат кулацкіх гаспадарак (Шпакоўскі, Лаліценка, Буеў і інш.) зусім не прыступілі да выканання збожжапаставак. На **Быхаўскім, Бягомльскім, Бялыніцкім, Бярэзінскім, Горацкім, Дубровенскім і Лепельскім** раёнах пры чаўнасці кулацкіх гаспадарак паступленне збожжапаставак не значыцца. Наводле распараджэння райупаўнаважанага камзага Касцюковіцкага раёна тав. **Бабравельскага** прыёмачным пунктам Загазбожжа прынята вільготнага ячменю ад здатчыкаў 22 тоны (20-22 проц.). **Магілеўскай МРК Загатзбожжа** не адрамантаваны дахі ў складах №№ 5 і 6, і вада ад дажджу працякае на збожжа. З верасня мука выгружалася з вагонаў у парваных мяхах і рассыпалася па зямлі. У Слуцку, Менску, Віцебску і Бабруйску начной праверкай брыгадамі РСІ аховы збожжаскладаў устаноўлена, што вартаўнікі на многіх складах спалі. Брыгадамі вынесены са склада розныя рэчы, а ў Менску нават зброя ў часткі вартаўнікоў.

Адзначанае сведчыць, што паказанымі канторамі Загатзбожжа не выконваецца дырэктыва партыі і ўрада аб ахове збожжаскладаў.

Выходзячы з вышэй адзначанага, прэзідыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ Бел. пастанаўляюць:

1. Папярэдзіць **РК, РКК і РВК Віцебскага, Быхаўскага, Бярэзінскага, Горацкага, Дубровенскага, Лепельскага і Чашніцкага** раёнаў, што калі імі не будзе забяспечан пералом у выкананні плана збожжапаставак у бліжэйшыя дні, ЦКК будзе разглядаць, як ігнараванне імі дырэктыў партыі і ўрада аб збожжапастаўках.

2. За ігнараванне дырэктыў партыі і ўрада аб устанаўленні праверанай аховы склада, адсутнасць кантроля і праверкі за работай вартаўнікоў, загадчыку менскай МРК тав. АСНІНУ, Слуцкай —тав. ГОЛЬДБЕРГУ, загадчыку тэхбазай —тав. РАМАШЭЎСКАМУ і віцебскай — тав. ХАЙКІНУ абвясціць суровую вымову і папярэдзіць, што калі імі па працягу 3-х дзён не будзе прведзена ахова збожжаскладаў у адпаведны парадак, яны будуць прыцягнуты да больш суровай адказнасці.

3. Прыняць да ведама паведамленне тав. **Амбражэвіча**, што віноватыя ў нядбайных адносінах да аховы збожжаскладаў (вартаўнікі і загадчыкі складаў) слуцкай, менскай, бабруйскай і віцебскай РКК прыцягнуты да адказнасці.

4. За неадрамантаванне дахаў у збожжасскладах № 5 і 6, ад чаго працякае дажджавая вада на збожжа, і неарганізацыю перавозкі мукі са станцыі ў горад, што пацягнула страту мукі і прастой аўтамашын, нам. загадчыку Магілеўскай МРК тав. **Фішману** абвясціць суровую вымову. Абвязаць тав. **Сарока** і тав. **Фішмана** ў аднадзенны тэрмін адрамантаваць дах у збожжасскладах № 5 і 6 і зжыць дапушчаныя імі памылкі і нядбайнасць у рабоце.

5. За нядбайнае бунтаванне збожжа пры млыне «Адраджэнне» ў г. Менску (пабудова нядобраякаснага бунта, непабудаванне даха над ім і дрэннага насыпа падлогі), што пацягнула псаванне збожжа і прарастанне, — нам. дырэктара Белтроста Галоўмукі тав. **Рыўкіну**, члену КП(б)Б, абвясціць суровую вымову і прапанаваць у 3-дзённы тэрмін убрать збожжа з бунта шляхам перамола на млыне.

Прыняць да ведама, што тэхнік, будаваўшы бунт, Мен. гарКК аддан пад суд.

6. Прапанаваць начальніку Галоўміліцыі тав. **Флексеру** даць указанне гарадскім і раённым аддзяленням аб устанаўленні імі дзяжурстваў на прыёмачных пунктах і сістэматычнай праверкі становішча аховы збожжаскладаў.

7. За адсутнасць кантроля за работай прыёмачных пунктаў і аховы збожжа **старшыні Касцюковіцкай РКК-РСІ** абвясціць вымову.

Прэзідыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ Бел. папярэджваюць усіх старшынь РКК-РСІ, што за дапушчэнне агіднага хавання і раскрадвання збожжа на складах і прыёмачных пунктах, а таксама несвяўчасовае выкананне плана збожжапаставак яны будуць адказваць пароўні з арганізацыямі, якія нясуць непасрэдную адказнасць за гэту справу.

За старшыню ЦКК КП(б)Б Нам. наркома РСІ БССР КОНІК.

БЕСПРЫТУЛЬНАЕ ЗБОЖЖА

ПРОЛЕТАРСКАЯ ГРАМАДСКАСЦЬ ПАВІННА ЎЗЯЦЬ ЗБОЖЖАСКЛАДЫ ПАД КАНТРОЛЬ

Кіраваць—значыць прадбачыць

Беларуская кантора Загатзбожжа спаткала збожжапастаўкі невыстарчальна падрыхтаваны. З 17 новых складаў для збожжа да пачатка адачы яго былі гатовы толькі 9. Рамонт некаторых складаў не быў закончан да пачатка збожжаздачы, а сям-там (Слуцак, Дрыса, Чашнікі, Магілеў) не скончан да гэтага часу. Многія склады засталіся без дахаў, са цячыламі ў падлогах і сценах.

Беларуская кантора Загатзбожжа не чакала, **не прадбачыла**, што збожжа пачне паступаць вялікімі масамі і што ў жніўні будзе ў значнай ступені выканан верасневуські план паставак. Таму беларуская кантора Загатзбожжа ў пачатку трэцяй дэкады жніўня аказалася перад фактам, калі ні ў Менску, ні ў Віцебску, а потым і ў Гомелі не хапіла складской плошчы. У Менску з-за недахвата складаў пачат стварыўся «проб ка» ў 200 перагружаных вагонаў. Прыпалося заняць пад збожжа рад гарадскіх памяшканняў, клубы і інш.

Таксама зняцыцку былі захоплены многія прыёмачныя пункты міжраённых кантор. Яны не чакалі магутных чырвоных абозаў. З 2.000 фурманак, якія прыбылі чырвоным абозам 13 жніўня ў Барысаў, 600 прымушаны былі адвезці збожжа назад. Ссынныя пункты міжраённай канторы не справіліся з прыёмкай збожжа. На многіх ссынных пунктах трацілася ў спрэднім да 50 мінут, а ў паасобных выпадках нічэ больш часу, каб прыняць збожжа ад аднаго здатчыка.

Зладзеяў паставілі ля вагаў

Каля прыёмачнікаў не былі падрыхтаваны. Потым, калі трэба было тэрмінова паставіць людзей ля вагаў, пачалі браць першага сустрэчнага. На некаторых пунктах ля вагаў былі пастаўлены класава-чужыя элементы. На талачынскай тэхбазе прыёмачык **Хаўрутэвіч** выпісаў свайму дзядзьку Хаўрутэвічу Даніле прыёмную квітанцыю на 105 кілограм збожжа, якое на склад не паступіла. Прыёмачыца, крычаўскай тэхбазы **Белячкова Таццяна** выпісала квітанцыю свайму бацьку — былому попу — па нібыта зданых 320 кілограм збожжа. Прыёмачык рачыцкай тэхбазы **Сергіенка**, схаваўшы свой сапраўдны твар за комсамольскім білетам, выпісаў адпасобніку Быкоўскаму Герасіму квітанцыю на пададзеных 168 кілограм збожжа. На адатачным пункце ў Дрысе былі выкрыты злоўжыванні сына цвёрдаадданніка **Канашонка**. У Магілеве на прыёмачным пункце па Віленскай вуліцы працаваў былы гаплляр **Агрэст**. На дрысенскай тэхбазе загадчык складам борканцкага пункта Загатзбожжа **Шаналіда** і прыёмачык **Добрасолец** сістэматычна абвешвалі здатчыкаў.

На радзе пунктаў нагадаліся выпадкі грубага парушэння прадпісыўлінь, ад якіх цярпелі здатчыкі. На прыёмачным пункце № 1 у Віцебску таксіроўшчык **Осіпаў** і касір **Смалеўская** замест 7-мі гадзін раніцы прыходзілі ў 9 гадзін і прымушалі здатчыкаў доўгі час іх чакаць. Прыёмачык **Кляпец** на камарынскім ссынным пункце не толькі позна з'яўляўся на работу, але сярод белага дня пакідаў работу, прымушаючы сялян чакаць па 3 гадзіны.

Абслугоўванне здатчыкаў жадае лепшага. Ларкі, як правіла, не маюць патрэбных тавараў, не маюць нават такіх дробязей як соль, запалкі, махорка і інш. Пры некаторых пунктах не пабудаваны вальмоі і коняпрывязі. На радзе пунктаў няма кансультацыі, чайных, газет, літаратуры. З 143 радыёкролак паводле плана — устаноўлена 39, але і з гэтых значная частка не працуе. Аб якасці агітацыі можна меркаваць па адным з лозунгаў, вывешаных на збожжаскладзе ў Віцебску. «Калгаснік! — кліча гэты лозунг, — усё сваё збожжа вазі на калгасны рынак».

Вартаўнікі спяць

Склады ахоўваюцца вельмі дрэнна. Рэйды і налёты органаў пракуратуры і РСІ ніколі не канчаюцца без «здабычы». Почну з 8 па 9 верасня брыгада менскай пракуратуры і РСІ забрала ў спічага вартаўніка менскага цэнтральнага склада — **Рэйдэра** — вінтоўку, папярэдня абыйшоўшы ўсе куты склада. Вартаўнік часовага склада ў садзе «Прафінтэрн» **Рандаровіч** спаў у будцы для продажу нарзана. Яго знайшлі пасля доўгіх пошукаў, свісткоў і крыкаў. Брыгада, якая праверыла ахову склада № 3, абыйшла ўвесь двор, зашла ў кантору, заброла арыфмометр і дзве сярпы з картаткай, потым з пажарнага памяшкання вынесла пажарны рукаў ад машыны, оякеру, кажух вартаўніка і ўсе гэтыя рэчы па асветленым двары адвезла ў штаб рэйда. Вартаўнік склада менскай міжраённай канторы **Левін** пусціў праверачную брыгаду на склад, не запытаўшы пропуска.

У Віцебску «лёгкія кавалерысты» бес перашкоды прайшлі на склад і забралі два агнятушыцелі, ключ ад складаў, штамп і затвор ад вінтоўкі.

У Магілеве праверачная брыгада вынесла са склада міжраённай канторы агнятушыцель. Вартаўнік **Жалоўдзін** гэтага не заўважыў.

Шмат збожжа прападае з-за адсутнасці кантроля за правільным хаваннем, з-за адсутнасці барацьбы са стратамі. З рада месц сігналізуюць, што збожжа псуецца, «гарыць», або мокне пад дажджом, рассыпаецца і г. д. (склады № 2 і 41 у Віцебску, цэнтральны склад у Менску).

Кіраўніцтва з габінетаў

Усе гэтыя факты даюць даволі поўнае ўяўленне аб якасці кіраўніцтва беларускай канторы Загатзбожжа і яе філіялаў — міжраённых кантор.

— Белкантора Загатзбожжа, — гаворыць старшыня масцкома менскай канторы тав. **Пагост**,—кіравала «адной папяровай цеганінай...».

Ён-жа расказаў на апошнім пасяджэнні прэзідыума ЦП саюза мукамолаў, як тыдні тры-чатыры таму назад з Белканторы Загатзбожжа быў атрыман цыркуляр аб падрыхтоўцы складаў да прыёмкі збожжа, у якім, між іншым, прапанавалася неаскладна ачысціць... **дахі ад снега (!?).** Цікава было-б ведаць, што думае рабіць белкантора зімой? Ці не дасць яна дырэктыву, каб зімой рамантаваць дахі складаў на выпадак дажджа?

Белканторы Загатзбожжа мае велізарны апарат—**80 чалавек.** Паводле слоў намесніка кіраўніка канторы тав. **Хейфэца**, толькі 12-13 чалавек пабывалі, за час адачы збожжа, на перыферыі. Астатнія,—гаворыць тав. Хейфец,—не адказныя, а тэхнічныя работнікі. Але і гэтыя паседзелі шмат карысці не далі. Факты злоўжываванняў, пакраж, паплываўдзельскіх адносін да аховы складаў былі выяўлены органамі пракуратуры і РСІ, але не работнікамі Белканторы.

Кіраўнік Белканторы тав. **Журомскі** быў здолен толькі **скерыстаць матэрыялы пракуратуры аб ужо знятых з работы і асуджаных кулацкіх агентах і злодзеях** і аддаць загад аб... **зняцці іх з работы і аддачы пад суд.** Так, у загадзе па Белканторы ад 7 **верасня** тав. **Журомскі** прапануе зняць з работы і аддаць пад суд прыёмачыцу Крычаўскай тэхбазы Белячкову Таццяну, якая паводле паведамлення Крычаўскага пракурора ад **28 жніўня** асуджана нарсудом на 10 год пазбаўлення волі. **7-га верасня** ён прапануе зняць з работы жулапкага агента—работніка камарынскага сена—прыёмачыка пункта Бразілоўскага Пятра, які, паводле паведамлення пракурора Камарынскага раёна, асуджан да пазбаўлення волі яшчэ **25 жніўня** і г. д.

Якую мэту праследваў тав. Журомскі выданнем такога загада? Адзіная мэта яго—**застрахавацца, ашукаць партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі**, стварыць уражанне, што Белкантора не оціць, выяўляе чужы элемент, знімае з работы, аддае пад суд... Сярод работнікаў-жа Загатзбожжа гэты загад выклікаў толькі іранічную ўхмылку.

Такое ігнараўніцтва, зразумела, **не забяспечвае нармальнай вырэзнай работы загатоўчых і складскіх работнікаў.**

ЦП саюза мукамолаў шуміць...

Якую роль адыгрываюць у загатоўчай кампаніі **прафсаюзныя арганізацыі**, у першую чаргу **прафсаюз мукамолаў**, аб'яднаўчы работнікаў загатоўчага апарата? Вычарпальную ацэнку работы саюза даў на апошнім пасяджэнні прэзідыума ЦП мукамолаў (16 верасня) сам адказны сакратар ЦП тав. **Гурэвіч.**

— Мы ўзялі вялікі шум,—заявіў ён, **—але зрабілі мала...**

Так, супроць фактаў не напрэш. Можна толькі дадаць, што зроблена **вельмі** мала.

Асноўная бяда ЦП саюза, што яно не здолела заваяваць сабе аўтарытэт хоцьбы ў кіраўнікоў Белканторы Загатзбожжа. Гэта-ж факт, што нават у асноўным для прафарганізацыі пытанні—пытанні **зарплаты**—ЦП аказаліся ў баку. Стаўкі для загадчыкаў складаў, прыёмачыкаў і вартаўнікаў былі ўстаноўлены Белканторай Загатзбожжа **без удзела ЦП саюза.** ЦП дазвалаліся абгэтым потым, ад трэціх асоб.

Без удзела прафсаюза мукамолаў прайшло і камплектаванне апаратаў міжраённых кантор і складаў. Гэта з'яўляецца адной з асноўных прычын засмечанасці апарата Загатзбожжа ласава-чужым элементам. **Выяўленне чужых людзей, барацьба з засмечанасцю апарата** таксама праходзіць без актыўнага ўдзела прафсаюзных арганізацый. Характэрна, што ў Менску, дзе знаходзіцца ЦП саюза, **сход вартаўнікоў скліка пракуратура.**

Трэба сказаць, што ў радзе гарадоў і раёнаў ініцыятыва ў арганізацыі рэйдаў, налётаў, ініцыятыва ў выяўленні чужых элементаў аказалася ў руках пракуратуры і РСІ. Гэта, зразумела, **не дрэнна.** Дрэнна тое, што, у многіх месцах грушкомы мукамолаў шры арганізацыі рэйдаў абмежаваліся роляю пасіўных назіральнікаў.

І зараз, калі па многіх складах Загатзбожжа вільготнае збожжа знаходзіцца пад пагрозай псавання і патрэбна **тэрміновая масавая дапамога для перапачвання яго**, калі патрэбен **самы пільны большэвіцкі кантроль пролетарскай грамадскасці**—у ЦП саюза мукамолаў **не адчуваецца сапраўднай трывогі.**

Ахова збожжаскладаў—справа ўсёй пролетарскай грамадскасці

Рад карысных масавых мерапрыемстваў, пачатых у першых лічбах верасня, не даведзены да канца. 6-га верасня прэзідыум ЦПСПВ вынес пастанову аб арганізацыі **шэфства прадпрыемстваў над прыёмачнымі пунктамі і збожжасклядамі.** Гэта пастанова не выканана. У шэфства над збожжасклядамі ўключыліся фізкультурнікі. Аднак, толькі 4-5 калектываў фізкультурнікаў (хлебакамбінат, ЦПКіО, «Камунарка», «Чырвоная зара») сёе-тое робяць, астатнія не цікавяцца гэтым пытаннем. Пракуратурай рэспублікі высунута прапанова аб **стварэнні брыгад рабочых прадпрыемстваў і пабудоў** для аказання дапамогі складам, якія адчуваюць патрэбу ў дробным, але неаскладным рамонце. Аб гэтым мерапрыемстве пакуль што толькі гаворыць. Што робіцца на перыферыі—у ЦП саюза не ведаюць. Сувязь з прупкамамі вельмі слабая.

Справа абслугоўвання збожжаздачыкаў, аховы збожжаскладаў ад раскрадвання і страт — гэта справа не аднаго толькі саюза мукамолаў. Гэта справа **ўсіх прафсаюзаў, усіх працоўных.**

Прэзідыуму ЦПСПВ не пашкадавала-б праверыць, што робіць кожнае ЦП саюза для аховы збожжаскладаў, для паспяховага заканчэння збожжаздачы, для лепшай пагрузкі, перавозкі і выгрузкі збожжа, што робіць у гэтым напрамку гарпрафсаветы і фабзаўмясцкомы...

ЦПСПВ аддае гэтаму пытанню яшчэ далёка невыстарчальную ўвагу.

ПРАЎДЗІН.

Пабудуем эскадрылью імя Кагановіча

Узмацніць тэмпы збора сродкаў

За апошнія дні наглядаецца аслабленне тэмпаў збора сродкаў на эскадрылью імя тав. Кагановіча. «Звязда» ўжо некалькі раз ўказвала на адсутнасць якой-бы там ні было работы ў гэтым напрамку ў **Асвейскім, Вушацкім, Лельчыцкім, Парыцкім, Тураўскім, Чачэрскім і Чырвонапольскім раёнах.** З гэтых раёнаў за ўвесь час кампаніі не паступіла ні адной капейкі. Такое становішча, як відаць, ніколькі не турбуе раённых арганізацый і раённы друк. Ячы нават не палічылі патрэбным адгукнуцца на ўказанні «Звязды». Проста дзіву даешся, як могуць райкомы партыі, райвыканкомы, райпрафсаветы так бестурботна адносіцца да важнейшай палітычнай справы. Відаць, прычына ў простай недзяцэнцы і ігнараванні кампаніі. Ініцыятыва мас сустрэла тут яўнае супраціўленне.

Зусім дрэнна праходзіць збор сродкаў у **Бешанковіцкім, Клічаўскім, Лоеўскім, Прапойскім, Суражскім, Уваразіцкім, Чашніцкім** і іншых раёнах. Тут сумы збора складаюць ад 90 да 400 руб. Некаторыя раёны, нядрэнна разгарнуўшы кампанію з яе пачатку, зараз згарнулі яе, фактычна спынілі збор сродкаў. У першую чаргу гэта датычыць Магілева і Оршы. Зусім нязначныя паступленні ў апошнія дні і з прадпрыемстваў і вёсак Менскага раёна.

Нельга ні ў якім разе дапусціць, каб тэмпы паступлення сродкаў знізаліся, наадварот, іх трэба ўзмацніць. Для выканання ўзятага абавязацельства па пабудове эскадрыльі на трэбна сабраць яшчэ шмат грошай і таму ніякіх гутарак аб згортванні кампаніі не можа быць. Збор сродкаў неабходна максімальна ўзмацніць. Галоўная ўмова поспеха—шырокая масавая работа, соцыялістычнае спаборніцтва. Раённыя арганізацыі павінны стаць па-сапраўднаму на чале ініцыятывы мас і ў бліжэйшыя дні завяршыць кампанію па зборы сродкаў.

На бягучым рахунку 826.574 руб.

За 20 верасня на бягучы рахунак Дзяржбанка № 160-7.814 паступіла ад арганізацый і ўстаноў гор. Менска 442 руб. З раёнаў **Полацкага**—2.670 руб.; **Мазырскага**—2.558 руб.; **Слуцкага**—1.607 руб.; **Лепельскага** — 1.456 руб.; **Веткаўскага** — 1.194 р.; **Жлобінскага**—751 руб.; **Глускага** — 142 руб.; **Рэчыцкага**—790 руб.; **Чаўускага**—210 руб.; **Талачынскага** — 437 руб.; **Старадарожскага**—644 руб.; **Заслаўскага**—207 руб.; **Бягомльскага** —251 руб.; **Лагойскага**—677 руб.; **Шклоўскага**—325 руб.; **Бярэзінскага** —298 руб. і **Дубровенскага** — 321 руб. Усяго за дзень паступіла 14.985 руб.

З пачатку збора на бягучым рахунку—826.574 руб.

Аб партдні 16 верасня г.г. на Менскім чыгуначным вузле

Пастанова сакратарыята ЦК КП(б)Б ад 19 верасня 1933 года

Заслухаўшы паведамленні членаў бюро ЦК і прэзідыума ЦКК, мабілізаваных ЦК на правядзенне партдня на транспарце ў Менску, ЦК адзначае, што ў выніку праведзенага партдня з усёй відавочнасцю ўскрываецца зусім невыстарчальная работа чыгуначнай партарганізацыі па перабудове работы ў адпаведнасці з пастановамі ЦК УсеКП(б) і СНК СССР аб чыгуначным транспарце і невыстарчальная барацьба ў радзе адказных участкаў з сабатажнікамі гэтых пастаноў і недастатковая дапамога з боку Менгаркома. Сямейнасць, «очковтирательство», разгільдзяйства і заціск самакрытыкі ўсё яшчэ моцна караняцца ў радзе звенняў транспарта менскага вузла.

ЦК звяртае ўвагу партарганізацыі вузла на неабходнасць аказання ўсямернай дапамогі камісіям па чыстцы тых арганізацый, дзе яшчэ не скончылася чыстка — па рашучым выкрыцці бюракратаў, перараджэнцаў з партбілетамі ў кішэні, «очковтирателей» і разгільдзяеў на транспарце і выяўленні ўсіх недахопаў, якія перашкаджаюць аздараўленню работы вузла.

ЦК указвае менскаму гаркому на невыстарчальную дапамогу транспартным партарганізацыям у перабудове работы і на недапушчальна слабае становішча партмасавай работы на такіх адказных участках, як завод імя Мяснікова, паравозное дэпо, службы шляху і г. д. І абавязвае намецыць практычныя меры па ўдзелу і дапамозе палітаддзелу аршанскага чыгуначнага раёна ва ўмацаванні партыйнай і арганізатарскай работы на менскім вузле.

ЦК даручае ЦКК-РСІ аказаць дапамогу палітаддзелу ў расследванні злачынней цеганіны з устаноўкай імпортнага варштата «Рапід» на абточцы бандажоў у рамонтна-механічным цэху завода імя Мяснікова і прыцягнуць вінаватых да найстражэйшай адказнасці.

ЦК абавязвае ўсе ГК і РК, асабліва гомельскі, жлобінскі і віцебскі, забяспечыць шырокую дапамогу і садзейнасць палітаддзелам чыгуначных раёнаў і дарог у правядзенні мерапрыемстваў па выніках партдня і далейшай работы па перабудове і ўмацаванні чыгуначнага транспарта.

Сакратар ЦК КП(б)Б ГІКАЛО.

ПАСТАНОВА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б

1. У сувязі з неабходнасцю ўзмацнення работы па загатоўках і снабжэння рабочых гарадоў, т. РЫСКІНА, сакратара ЦК КП(б)Б па снабжэнню, вызваліць ад абавязкаў старшыні менскай гарадской камісіі па чыстцы.

2. Старшынёй менскай гарадской камісіі па чыстцы прызначыць т. ЖАБРОЎСКАГА, вызваліўшы яго ад абавязкаў старшыні віцебскай гарадской камісіі па чыстцы.

3. Старшынёй віцебскай гарадской камісіі па чыстцы прызначыць члена гэтай камісіі т. ПАСЮКЕВІЧА П. І.

РЭСПУБЛІКАНСКАЯ КАМІСІЯ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ ПЕРАДКАСТРЫЧНІЦКАЯ ВЫТВОРЧАЯ ПЕРАКЛІЧКА ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАСТАНОЎ ЛІПЕНЬСКАГА ПЛЕНУМА ЦК І ЦКК АБ РАБОЦЕ ПРАМЫСЛОВАСЦІ

Самаабавязацельствы ператварыць у канкрэтныя справы

Не дапускаць у пераклічцы славеснай дэкларацыйнасці і параднай шуміхі

Шырацца рады удзельнікаў пераклічкі

Таварышы ільнапрадзільшчыкі! У сваім пісьце вы расказваеце аб становішчы вашай фабрыкі да рэвалюцыі, аб тых вялікіх дасягненнях у паляпшэнні матэрыяльна-бытавых умоў рабочых, якія дасягнуты вамі.

Мы не можам на сёнешні дзень з вамі раўняцца. Наша галантарэйная фабрыка імя Фрунзе зусім маладая. У нас замежнае абсталяванне, але мы не можам пахваліцца, што позунг тав. СТАЛІНА «БОЛЬШЭВІКІ ПАВІННЫ АЎЛАДАЦЬ ТЭХНІКАЙ» намі выканан.

Тав. БЕЛАЖАБСКАЯ—ударніца цэха пальто № 2 віцебск. фаб. «Сцяг індуст».

Прамфінплан 1932 года мы выканалі на 106 проц., але разам з гэтым мелі значнае недавыкананне па якасных паказальніках, у выніку чаго панеслі страту на 109,4 тыс. руб. Яшчэ горш у нас справа ў 1933 годзе. План за першае паўгоддзе выканан на 75,1 проц. Сабекошт замест зніжэння на 5,9 проц., павышан; з-за невыканання якасных паказальнікаў маем страт на 118 тыс. руб.

Для нас ваш выклік аб разгортванні ўсебеларускай пераклічкі фабрык і заводаў мае асаблівае значэнне. Мы не можам сустракаць XVI гадавіну Кастрычніка з такім ганебным прарывам.

Абмен вопытам перадавых прадпрыемстваў, цэхаў і брыгад павінен дапамагчы адстаючым прадпрыемствам перабудаваць сваю работу і гэтым самым ліквідаваць наяўны прарыў. Цалкам падтрымліваючы вашу ініцыятыву, мы ўключаемся ў перадкастрычніцкую пераклічку, якая павінна з'явіцца магутным сродкам уздыму, творчага ўздыму рабочага калектыва нашай фабрыкі ў справе разгортвання сапраўднай большэвіцкай барацьбы за рэалізацыю пастановы ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасці.

Мы зараз арганізавалі масавую прапрацоўку вашага закліка і перадавой «Звязды», на аснове чаго на кожным участку выпрацаван рад практычных мерапрыемстваў па ліквідацыі недахопаў у нашай рабоце. Абвешчан конкурс на лепшага рабочага-ўдарніка, лепшага брыгадзіра, зменнага майстра. Праводзім рад мерапрыемстваў па ўзнясці прадукцыйнасці працы і ўшчыльненні рабочага дня, уключаючы гэта з прапрацоўкай тэхпрамфінплана IV квартала.

Па даручэнні рабочых лепшыя ўдарнікі фабрыкі: ЗАЛАТАРОВА, КАРАВАЕВА, РАЙКО, ТАРЛЕЦКІ, ЗУБЧЭНКА, ГАРНАЧ, АШТАЛЬ, ГЕЛЬФАНД.

* * *

Пачын фабрыкі «Дзвіна» аб усебеларускай вытворчай пераклічцы прадпрыемстваў да кастрычніцкіх свят павінен з'явіцца магутным фактарам у справе ўзняцця энтузіязма рабочых мас на выкананне пастановы ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасці.

Мы зараз праводзім вялікую масавую работу вакол конкурса на лепшае прадпрыемства, абвешчанага гомельскім гарпрафсаветам, гарсаветам і «Палескай праўдай». Разгортваецца соцспаборніцтва паміж цэхамі. Але-ж судзіць мы павінны па выніках работы, а вынікі ў нас яшчэ далёка нездавальняючыя.

Зараз фабрычныя арганізацыі вядуць падрыхтоўку да фабрычнай партыйнай канферэнцыі па якасці і зніжэнні сабекошта, а таксама падрыхтоўку да гарадскога і ўсебеларускага злёту ударнікаў якасці.

Выпушчана пазыка па якасці і ўжо распаўсюджана 780 аблігацый сярод рабочых і адміністрацыйна-тэхнічнага персанала. Пазыкай ставіцца мета — поўнасцю зжыць пераробкі і бран, дабіцца высокаякаснай прадукцыі. Кожныя 10 дзён праяравецца, як кожны трымальнік пазыкі выконвае свае абавязкі. Тыраж пазыкі адбудзецца ў дні кастрычніцкіх свят. Першыя дзесяць дзён работы з пазыкатрымальнікамі паказваюць ужо зрух у паляпшэнні якасці прадукцыі, аб чым сведчыць апошняя прыёмка гатовай адзежы Саюзшвейзбытам.

Мы ўзяўнены, што вынікі чысткі парткалектыва і шырока разгорнутая масавая работа вакол пераклічкі ўзнімуць хвалю энтузіязма рабочых і ІТР, каб сустрэць XVI гадавіну Кастрычніка поўным выкананнем прамфінплана, высокай якасцю прадукцыі.

Тав. КАН—ударнік закройнага цэха віцебскай фаб. «Сцяг індустрыялізацыі».

Ад імя рабочых калектыва швейнай фабрыкі «Камінтэрн» — брыгада: КАЦНЕЛЬСОН, ЛЕВІТАН, ЛЕЙЗЕРОВІЧ, ПЕКУРОЎСКАЯ, ГУТКІН, БЛЯХЕР...

* * *

Рабочыя, работніцы і ІТР завода «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК» (Орша) ўключыліся ў перадкастрычніцкую пераклічку. На заклік рабочых фабрыкі «Дзвіна» калектыў завода узяў канкрэтныя абавязкі па выкананні прамфінплана на аснове соцспаборніцтва і ўдарніцтва, ліквідацыі брака, ушчыльнення рабочага дня і павышэння прадукцыйнасці працы.

Заўком ДАНІЛАЎ.

Папраўка

У нумары **«Звязды»** ад 19 верасня 1933 г. у карэспандэнцыі **«Мы і надалей будзем перадавікамі ў барацьбе за тэмпы і якасць»** (3-я старонка) выпадкова прапушчана назва прадпрыемства. Брыгада, работа якой апісваецца ў данай карэспандэнцыі, з'яўляецца з віцебскай швейнай фабрыкі **«Сцяг індустрыялізацыі».**

Агляд друку

„ГАРА РАДЗІЛА МЫШ“

(„Большэвік Барысаўшчыны“)

Пастанову ліпеньскага пленума ЦК і ЦКК КП(б)Б аб рабоце прамысловасці «Большэвік Барысаўшчыны» змясціў 10 жніўня. Да гэтага матэрыял аб прамысловасці быў рэдкім госцем на яго старонках. Але і пасля пастановы пленума становішча амаль не змянілася. «Б. Б.» займаецца пытаннямі работы прамысловасці ад выпадку да выпадку, рыўкамі. Больш таго, нават у тых скупых матэрыялах, якія газета друкуе, аб пастанове пленума зусім не ўспамінаецца, як быццам адзначаны пленумам недахопы работы прамысловасці не датычаць прадпрыемстваў Барысава.

Два тыдні пасля змяшчэння пастановы пленума «Б. Б.» аб рабоце прамысловасці літаральна маўчаў. 22-ж жніўня раптам выпаў з гістэрычна-крыклівым аппілагам над паласой:

«Не смець парушаць закона аб запыненні за адзін прагул без уважлівых прычын».

Паласа цалкам прысвечана барацьбе з прагульшчыкамі і лянтуямі. Але ўвесь матэрыял падаецца адарвана ад пытанняў перабудовы работы і метадаў кіраўніцтва вытворчасцю, ні адным словам не ўспамінаецца аб указаннях пленума па гэтым пытанні. Газета рэгіструє факты наяўнасці прагулаў на прадпрыемствах і ліберальных адносін да прагульшчыкаў з боку трыкутнікаў, не ўзнімаючы гэтых фактаў на належную палітычную вышыню, не робячы моцных аглядовых выводаў у адносінах да сабатажнікаў закона ўраду.

Прыводячы факты ліберальных адносін да прагульшчыкаў, «Б. Б.» самжа праяўляе лібералізм. Весь характэрны прыклад: дырэктар друкарні імя 1 мая тав. Патоцкі выдаў загад такога зместа:

«Рабочаму наборнага цэха тав. Шутко за невыход на работу 25, 26 і 27 ліпеня вынесшу вымову».

Факт ліберальных адносін да прагульнічка Шутко з боку дырэктара Патоцкага тут бясспрэчны. Абавязак газеты — рэзка выступіць супроць падобнага ліберальнічання, заваструць на гэтым факце ўвагу пролетарскай грамадскасці. «Б. Б.»-ж абмяжоўваецца на радай адпаведным арганізацыям:

«... растлумачыць як след Патоцкаму аб недапушчальнасці такога ліберальнічання са злоснымі прагульшчыкамі».

Добра разумее сваю ролю газета, нечага сказаць! Людзі злосна сабатуюць дырэктывы ўраду, а яна раіць заняцца растлумачэннем ім сушнасці гэтых дырэктыў.

25 жніўня «Б. Б.» выходзіць з другой паласой і з перадавой да яе аб раз гортванні «ізотаўскага пахода». І тут газета абыходзіць пастановы пленума, не глядзячы на тое, што пытанні аб аўладанні тэхнікай вытворчасці і перадачы вопыта добра кваліфікаванымі рабочымі слаба тлумачаным у пастанове займаюць важнейшае месца.

Аднак, справа не ў тым, каб успамінаць пра пастанову пленума. Патрэбна сістэматычная і ўпарная работа па хутчэйшай і паспяховай яе рэалізацыі. У рабоце-ж «Б. Б.» маюць перавагу метады рыўкоў, параднай шуміхі. А таму і атрымліваецца, што часам добрыя пачынанні да канца не даводзяцца і не прыносяць той карысці, якую яны могуць прынесці.

У свой час на шмат заяў прадпрыемствах Барысава праводзіліся канферэнцыі па зніжэнні сабекошта. Газета тады шмат пашумела, друкавала безліч дэкларацыйных абяцанняў і запэўненняў. Але потым адразу-ж сціхла. Прадпрыемствы па-ранейшаму павышалі сабекошт, а газета спакойна чакала роўна два з паловаю месяцы, каб раптам зноў выступіць з вялікім аппілагам над паласой:

«Мала выносіць прыгожыя рэзалюцыі і карысныя прапановы. Іх трэба практычна ажыццяўляць».

Было-б зусім добра, калі-б сюды даадаць: **«Мала адных вялікіх і вельмі разумных рашэнняў, патрэбна сістэматычна работа, упартая барацьба, шырокая мабілізацыя і арганізацыя мас».** Без гэтага газета— не газета, а пасыўны рэгістратар праяўленняў. Іменна такой газетай з'яўляецца «Б. В.»

На гуце імя Домбаля канферэнцыя па зніжэнні сабекошта праводзілася ў пачатку лёцця, а ў канцы жніўня газета схамянулася, што

**«

СОВЕЦКІЯ ЖУРНАЛІСТЫ НЕ ДАПУШЧАНЫ НА ЛЕЙПЦЫГСКІ ПРАЦЭС

БЕРЛІН, 20 (БЕЛТА).

Міністэрства прапаганды паведаміла саюзу замежнага друку ў Берліне, што ні адному з **СОВЕЦКІХ КАРЭСПАНДЭНТАЎ** у Берліне **НЕ ДАН ДАЗВОЛ** прысутнічаць на працэсе аб падпале рэйхстага.

Паводле вестак з інфармаваных крыніц, лейпцыгскім судом пастаноўлена не дапускаць на працэс представіцеляў комуністычнай і сацыял-дэмакратычнай прэсы, бо ад гэтых представіцеляў «нельга чакаць аб'ектыўнага асвятлення працэсу».

Трэба адзначыць, **што дазвол прысутнічаць** на працэсе атрымалі каля 30 замежных журналістаў.

Атмасфера дапусціць на працэс представіцеляў афіцыяльнага агенцтва СССР і буйных совецкіх газет нельга не расцэньваць, як яшчэ адзін пераканаўчы дыскрымінацыі представіцеляў совецкага друку.

* * *

АФІНЫ, 19 (БЕЛТА).

80 афінскіх адвакатаў звярнуліся ў германскае консульства з калектыўным лістом, прапануючы дапусціць грэцкага адвоката да абароны абвінавачаных у падпале рэйхстага.

Германскі паверанны ў справах адмовіўся задаволіць патрабаванне адвакатаў, заявіўшы, што можа толькі прасіць канцлера Гітлера дапусціць грэцкага адвоката ў якасці наглядальніка.

„РЭЙХСТАГ ПАДПАЛЕН НАЦ-СОЦЫЯЛІСТАМІ"

ВЫКРЫЦЦЁ БЫЛОГА НАЦ.-СОЦЫЯЛІСТА.

ВЕНА, 19 (БЕЛТА).

Газеты публікуюць адкрыты ліст былога члена германскай нацыянал-сацыялістскай партыі Штэфена, займаўшага ў партыі адказны пост і да чэрвеня выступаўшага ў ролі дакладчыка па заданнях нацыянал-сацыялістскага цэнтра.

Потым Штэфен выехаў з партыі і пераехаў на жыхарства ў Вену. У лісце Штэфена, адрасаваным да вярхоўнага пракурора ў Лейпцыг, гаворыцца, што пажар рэйхстага зроблен **ПА ДАРУЧЭННІ КІРАЎНІКОЎ ГЕРМАНСКАЙ НАЦЫЯНАЛ-САЦЫЯЛІСЦКАЙ ПАРТЫІ.** Паводле слоў Штэфена, яшчэ ў часе прэзідэнцкіх выбараў (у сакавіку 1932 г.) германская нацыянал-сацыялістская партыя пашырала адкрытку з малюнкам палаючага будынка рэйхстага, на якой значыўся наступны надпіс: «Рэйхстаг гарыць, хто будзе тушыць?»

З гэтага малюнка, — гаворыць Штэфен, — як з тэкста на здымку, узнікла мысль аб пажары рэйхстага, пасля чаго слова ператварылася ў справу.

— Сам я па сканчэнні майго прапагандысцкага турне па Памераніі прыбыў у Берлін праз 3 дні пасля пажара рэйхстага і як шляхам агляда месца пажара, так і шляхам гутарак з рознымі кіраўнікамі нацыянал-сацыялістаў, **ПРЫШОЎ ДА ПЕРАКАНАННЯ, ШТО ПАЖАР РЭЙХСТАГА ЗРОБЛЕН НЕ ПРАЦІЎНІКАМІ, А АВАНТУРНІКАМІ З НАШЫХ-ЖА ЎЛАСНЫХ РАДОЎ ПА ДАРУЧЭННІ ЗВЕРХУ.**

— Пасля гэтага я гутарыў з адным з галоўных судовых чыноўнікаў, у прысутнасці вышэйшага паліцэйскага афіцэра. Яны заявілі, што працэс аб падпале рэйхстага вельмі цяжка будзе правесці, бо няма падставы для ўзбуджэння справы. Апроч таго, трэба баяцца, што ў ходзе працэса будуць агалошаны вельмі кампраметуючыя матэрыялы, якія на нацыянальных і дазяржаўна-палітычных меркаваннях трэба было-б трымаць у тайне.

Штэфен раіць вярхоўнаму пракурору адмовіцца ад выдумванага абвінавачвання супроць Торглера і іншых комуністаў.

ВЯРБОЎКА ПРАВАКАТАРАЎ

БЕРЛІН, 20. (БЕЛТА).

Лейпцыгскі карэспандэнт «Б. ам Мітаг» падкрэслівае, што падсудным у працэсе аб падпале рэйхстага прадкіладзена абвінавачанне ў простай ці ўскоснай арганізацыі падпала.

Балгарскія комуністы Дэмітраў, Папоў і Танеў прыцягнуты да гэтай справы, бо, як сцвярджае «Б. Ц. -ам Мітаг», «удалося ўстанавіць іх сувязь з Ван дер-Любе».

Старшынстваваць будзе старшыня Вярхоўнага суда, былы саксонскі прэм'ер Бюнгер.

* * *

РЫГА, 19. (БЕЛТА).

Спасылаючыся на атрыманыя ім афіцыяльныя дакументы, «Сацыял-дэмакрат» паведамляе, што нацыянал-сацыялісты вярбуюць сярод германскіх палітычных эмігрантаў правакатараў для работы ў Германіі.

Як паведамляе газета, аднаму з іх удалося завербаваць эмігранта Бешміта, якому даручана пранікнуць у нелегальныя антыфашысцкія арганізацыі і, стварыўшы ва ўсходняй Прусіі канферэнцыі тэтых арганізацый, выдаць іх удзельнікаў фашысцкай паліцыі.

«Сацыял-дэмакрат» абвінавачвае латвійскі ўрад у патураньні рабоце нацыянал-сацыялістскіх агентаў.

БЯССІЛЬНАЯ ЗЛОСЦЬ

БЕРЛІН, 20. (БЕЛТА).

У гутарцы з супрацоўнікам «Фелькішэ беобахтэр» міністр Франк паскаў работы лондонскага грамадскага суда па справе аб падпале рэйхстага «нечуваным умяшаннем».

На пытанне, што Франк можа сказаць па поваду сцвярджэння, што нацыянал-сацыялісты самі падпалілі рэйхстаг, Франк заявіў, што рэйхстаг «пад палілі комуністы».

У пацвярджанне гэтай сваёй заявы Франк спасылаўся на «Комуністычны маніфест». На думку Франка, у «Комуністычным маніфесце» дасловна сказана, што надзеяй сусветнага комунізма з'яўляецца грамадзянская вайна ў Германіі. Пажары і разбурэнні — гэта бачныя ерэдкі комуністычнай сусветнай рэволюцыі».

УСЕАГУЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА НА КУБЕ

НЮ-ІОРК, 19. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Кубы, у Мэнзапільо адбыўся ўсеагульная забастоўка. Жандары адкрылі агонь па забастоўшчыках. Многія паранены. Згодна па ведамленню «Н'ю—Іорк таймс», каля Сант-яго забастоўшчыкі сапсавалі абсталяванне цукровых заводаў, якія належаць замежным капіталістам.

Прэзідэнт Мартын заявіў, што 1 красавіка адбудуцца выбары на ўстаноўчы сход, які будзе склікан 20 мая. Буржуазная апазіцыя па-ранейшаму патрабуе адстаўкі новага ўрада і патрэбуе паўстанням.

Адзін з лідэраў гэтай апазіцыі Блаз, які ў свой час кіраваў барацьбой узброеных атрадаў з дыктатарам Мачадо, дзейнічае ўнутры краіны, займаючы гарады і прасоўваючыся ў напрамку да Гаваны з мэтай скінуць урад Мартына.

ПРАПАГАНДА АНШЛЮСА

БЕРЛІН, 19 .(БЕЛТА).

У спорт-палацы адбыўся нацыянал-сацыялістскі мітынг пад лозунгам «падтрымання нацыянал-сацыялістскіх барацьбітоў у Аўстрыі».

Германскі інспектар аўстрыйскай нацыянал-сацыялістскай партыі Габіхт заявіў, што калі аўстрыйскі ўрад не спачыць у Аўстрыі парламенцкіх выбараў, цяперашняе становішча будзе зменена «рэволюцыйным шляхам».

Пры гэтым Габіхт патрэбаваў падкрэсліў:

«Тады ніхто не зможа ўзяць на сябе гарантыі за тое, што за пашыўшымі зараз у Аўстрыі асобамі нічога не здарыцца».

«Акружаючы свет, — заявіў далей Габіхт, — не мае ніякага права ўмешвацца ў барацьбу, якая адбываецца ў Аўстрыі. Гэта барацьба — барацьба паміж немцамі і вядзецца на аснове іх уласных законаў і іх уласнай ідэалогіі.

Нацыянал-сацыялізм не пацерпіць, каб Аўстрыя была буфэрам старонніх дзяржаў супроць Германіі. Мы цвёрда ўпэўнены, што і над Аўстрыяй узыдзе сцяг нацыянал-сацыялістскі сцяг».

* * *

ВЕНА, 18. (БЕЛТА).

У Грацы па сход кіруемага ландфундам нацыянальна-саслоўнага фронта напала некалькі сотень нацыянал-сацыялістаў.

У сутычцы паранена 15 чалавек. Прыбыўшая конная жандармерыя арыштавала каля 160 нацыянал-сацыялістаў.

У Шпіталі (Карантыя) адбылася сутычка паміж нацыянал-сацыялістскімі дэманстрантамі і жандармерыяй, на дапамогу якой прыбыла вясковая часць. Шмат нацыянал-сацыялістскіх дэманстрантаў паранена.

ДЭКЛАРАЦЫІ І СПРАВЫ

МАСКВА, 20. (БЕЛТА).

Каментуючы паведамленні аб налёце нацыянал-сацыялістаў на клуб совецкай калоніі ў Берліне, «Известия» пішуць:

«16-га верасня ўвечары на прыёме представіцеляў замежнага друку германскі міністр замежных спраў **НЕЙРАТ** выступіў з дэкларацыяй, прысвечанай знешня-палітычным пытанням.

У гэтай дэкларацыі ён між іншым выказаў упэўненасць, што апраўдаўшыя сябе на працягу году прыязныя адносіны паміж Германіяй і Совецкім Саюзам і ў далейшым будуць плённа развівацца.

Совецкі друк не каментаваў гэтай дэкларацыі. Але за тое пераканаўчы каментарый да яе далі берлінскія штурмавікі і берлінская паліцыя. У тойжа вечар, калі германскі міністр замежных спраў у дэкларацыі выказваў упэўненасць, што прыязныя адносіны паміж Германіяй і Совецкім Саюзам і ў далейшым будуць плённа развівацца, берлінскія штурмавікі і берлінская паліцыя арабілі нечуваны нагны налёт на клуб совецкай калоніі ў Берліне, дзе незадоўга да налёта прысутнічаў паўнамочны представіцель СССР у Германіі тав. Хінчук.

«Каментарыі» да дэкларацыі фон Нейрата, далыя берлінскімі штурмавікамі і берлінскай паліцыяй, яшчэ раз падцвярджаюць, што заявы адных адказных кіраўнікоў германскай палітыкі супярэчаць справам іншых органаў той жа палітыкі.

Як відаць, у Германіі мала турбуюцца аб тым, каб заграніцай адносіліся з належным давер'ем да афіцыяльных заяў кіраўнікоў германскага ўрада».

Праграма шырокай інфляцыі

НЮ-ІОРК, 19 (БЕЛТА).

Вашынгтонская канферэнцыя 150 дэлегатаў, якія представляюць інтарэсы буйных уласнікаў бавўняных плантацый, выказалася за тое, каб урад неадкладна звярнуўся да шырокай інфляцыі, шляхам выпуска грашовых знакаў, незабяспечаных золатам.

Рашэнні канферэнцыі, у якой прынялі удзел біднейшыя дзячы дамакратычнай партыі ў Паўднёвых Штатах (у тым ліку сенатар Сміт ад Паўднёвай Караліны, сенатар Томас ад Оклагамы—аўтар закона аб грашовай інфляцыі і інш.), адлюстроўваюць узрастаючае незадавальненне палітыкай Руз вельта ў некаторых пластах дэмакратычнай партыі.

9.500.000 ДЗЯЦЕЙ ПА-ЗА ШКОЛАЙ

НЮ-ІОРК, 19. (Уласная інфармацыя «Звязды»).

Эканамічны крызіс нанёс цяжкі ўдар таксама і ўсёй сістэме народнай асветы ў ЗША. Ужо на працягу многіх месяцаў абанкрутаваўшыя муніцыпалітэты не выплачваюць пенсіі выкладчыкам, зачыняюць школы і выключаюць з бюджэта выдаткі на народную асвету.

Чыкаго, другі горад Амэрыкі, дзе цэнтр пад крыклівай назвай «Век прагрэса» адбываецца грандыёзная выстаўка тэхнічных дасягненняў ЗША, мае запазычанасць сваім выкладчыкам пенсіі за 1932 г. 12 мільёнаў долараў.

Школадалы, выгнаныя з сваіх кватэр настаўнікі спачатку лета арганізавалі ўзбраўлены бунт і пачалі нападаць на чыкагоскія банкі.

Частка амерыканскай буржуазнай прэсы на чале з найбольш рэакцыйным «Чыкага Трыбюн» вядзе ў сучасны момант шырокую кампанію за зніжэнне выдаткаў на ўтрыманне школ. Пад уплывам гэтай кампаніі ў Чыкага закрыты амаль усе вячэрнія школы і ў гэтым годзе не была адчынена наводная летняя школа. Усе школьныя спартыўныя пляцоўкі, за выключэннем адной, закрыты. Школьны аддзел чыкагскага муніцыпалітэта звольніў 1.000 выкладчыкаў і рашыў закрыць рад школ другой ступені і шмат музыкальных і спартыўных школ.

Тое, што адбываецца ў Чыкаго, паўтараецца ва ўсёй краіне.

Лева-буржуазны штотыднёвік «Нейшэн» лічыць, што «ўсёй сістэме народнай асветы патрэбна непасрэдны правал». У штаце Алабама ў першым квартале бягучага году былі закрыты 85 проц. усіх школ першай ступені і ўсе школы другой ступені. У іншых — скарочан лік навучальных гадзін.

Пачынаючы з 1-га студзеня, ва ўсёй краіне закрыта вялікая колькасць школ і дзеці адпраўлены па дамах.

Гандлёвая палата ПШ вядзе энергічнае наступленне на народную асвету. Палата патрабуе скарачэння часу вучобы ў школах першай і другой ступені, скарачэння навучальнага года на 1 месяц і ўчэбнага дня на 1 гадзіну, завяршэння вячэрніх курсаў і дзіцячых садоў, скарачэння заробка выкладчыкам і г. д.

Па статыстычных даных Асацыяцыі народнай асветы, бюджэт народнай асветы па Н'ю-Іорку ў 1933 годзе быў скарочан на 20.000.000 долараў.

Дырэктар Бюро даследаванняў Асацыяцыі народнай асветы канстатаваў, што на працягу навучальнага года не менш 170.000 дзіцячых садоў былі закрыты ці скарацілі лік дзяцей да мінімума, у 120 гарадах зачрыты вячэрнія курсы, 170 школ для адстаючых дзяцей і 160 музыкальных і фізкультурных школ.

Прафесар Павел Морт падлічыў, што на працягу мінулага навучальнага года 9,5 МІЛЬЁНАЎ АМЕРЫКАНСКІХ ДЗЯЦЕЙ У РЭЗУЛЬТАЦЕ КРЫЗІСА ПАЗБАЎЛЕНЫ БЫЛІ МАГЧЫМАСЦІ НАВЕДВАЦЬ ШКОЛУ.

ЗАБОЙСТВА ЧЛЕНА ЦК КОМПАРТЫІ ПОЛЬШЧЫ тав. РЭДЫКО

Польская газета «Тыдзень», якая выдаецца ў Парыжы, у нумары ад 17 верасня публікуе паведамленне Цэнтральнага камітэта комуністычнай партыі Польшчы аб забойстве члена ЦК тав. РЭДЫКО.

Тав. Рэдыко быў забіт агентамі польскай дэфэнзывы ў ноч з 20 на 21 жніўня недалёка ад Варшавы па дарозе, вядучай у мястэчка Влохі. Паліцэйскае паведамленне, змешчанае на наступным дзень у буржуазным друку, гаворыць аб знойдзеным трупе, якога нельга было распазнаць з прычыны таго, што твар быў пакалечан да непазнаваемасці.

Замоўчваючы прозвішча тав. Рэдыко, паліцыя прабуе прадставіць гэта забойства, як забойства з мэтай грабяжа. Але да сёнешняга дня паліцыя не апублікавала рэзультатаў расследвання, а буржуазны і сацыял-фашысцкі друк больш ні слова не сказаў аб забойстве.

Тав. Рэдыко, рабочы-мебельшчык, быў адным з лепшых і адданейшых змагароў за пролетарскую рэволюцыю. Маладым юнаком уступае ён у рады змагаючагася пролетарыята і ў 1920 г. у часе барацьбы за Совецкую ўладу ў Польшчы, тав. Рэдыко з'яўляецца ўжо членам рэўкома ў яго родным горадзе Млаве. Пры адступленні Чырвонай арміі ён уступае ў рады Чырвонай арміі і актыўна змагаецца на франтох грамадзянскай вайны.

У 1924 г. тав. Рэдыко варочаецца ў Польшчу і як выдатны па сваіх здольнасцях і актыўнасці комсамолец неўзабаве працуе ўжо, як член Цэнтральнага камітэта комуністычнага саюза моладзі Заходняй Беларусі, а потым член і пазней як сакратар Цэнтральнага камітэта комсамола Польшчы. У 1926 годзе тав. Рэдыко быў арыштаван і прасядзеў у турме 5 год. Пасля выхада на волю, не гледзячы на цяжкую хваробу, ён зараз-жа зноў кідаецца ў рэволюцыйнае змаганне. Пад яго кіраўніцтвам была праведзена баявая першамайская дэманстрацыя ў Дам броўскім басейне, якая ўвайшла слаўнай старонкай у гісторыю рэволюцыйнага руху Польшчы. Да самага моманту заўчаснай смерці тав. Рэдыко заставаўся на адказных кіруючых пастах комуністычнай партыі Польшчы.

Паведамленне ЦК компартыі Польшчы канчаецца наступнымі словамі: «Перад таварам новай хвалі класавых баёў, якія ўсё больш пашыраюцца па ўсёй краіне, польская буржуазія пераходзіць да гітлераўскіх метадаў барацьбы з компартыяй. Сіпляскія паўстанні, ахапіўшыя ў Сярэдняй Галіцыі да 100 тысяч сялян, грандыёзная забастоўка подзінскіх тэкстыльшчыкаў, забастоўкі будаўнічых рабочых, нарастаючы рух гарнякоў і металістаў — усё гэта выклікае шалёную рэакцыю з боку азвярэлага фашызма. Пралаўленнем гэтага з'яўляецца палявы суд у Кобрыне, вялікі працэс комуністаў у Луцку, крывавая расправа над сялянамі ў Сярэдняй Галіцыі, у Брэсцкай акрузе, на Заходняй Беларусі.

Але фашысцкія каты памыляюцца, думаючы, што масавымі арыштамі, забойствам комуністычных дзячоў можна затармазіць размах рэволюцыйнага руху і спыніць нарастанне пролетарскай рэволюцыі.

Падобна таму, як смерць Гібнэра, Кнісўскага, Рутковскага, Гейчыка, Пілярчыка, Энгеля, Ботвіна і многіх іншых змагароў польскага пролетарыята ўзьняла на барацьбу сотні тысяч эксплаатуемых рабочых і сялян, так і на мяць аб т. Мецеку Рэдыко з'явіцца заклікам да новых вялікіх баёў за зваяжэнне злачынкай, злітай крывёю пепшых сыноў пролетарыята і працоўнага сялянства фашысцкай дыктатуры».

АБ ХОДЗЕ ДВУХДЭКАДНІКА ПА ДРОВАЛЕСАЗАГАТОЎКАХ І ВЫВАЗЦЫ

Пастанова Совета Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б

Абвешчаны СНК БССР і ЦК КП(б)Б з 5 верасня двухдэкаднік па дровалесазагатоўках і вывазцы праходзіць зусім дрэнна і фактычна кіякага зруху ў дровалесавывазцы няма.

Вінаватыя ў гэтым: упаўнаважаны Народнага Камісарыята Лясной Прамысловасці БССР, які не завастрыў увагі арганізацый на правядзенне гэтага двухдэкадніка і спакойна аднёсся да гэтай справы, а таксама райкомы і раённыя выканаўчыя камітэты, якія фармальна-бюракратычна аднесліся да гэтай важнейшай гаспадарчай кампаніі і не зразумелі значэння гэтага мерапрыемства. Усё гэта ставіць пад пагрозу поўнага зрыва снабжэнне апалам прамысловасці і гарадоў.

Совет Народных Камісараў БССР і ЦК КП(б)Б пастанаўляюць:

1. Абавязаць упаўнаважанага Народнага Камісарыята Лясной Прамысловасці, пад персанальную адказнасць т. т. Розіна і Дваравецкага, сакратароў райкомаў і старшынь райвыканкомаў, пад іх персанальную адказнасць, сапраўды па-большэвіцку разгарнуць работу па дровалесавывазцы, прычым адгаворкі аб занятасці гужа і рабочай сілы ўборкай і загатоўкай не могуць мець месца.

2. У сувязі з тым, што з пачатку двухдэкадніка нічога не зроблена, лічыць гэты двухдэкаднік з 20 верасня па 10 кастрычніка.

3. Абавязаць членаў бюро ЦК і членаў СНК, якія знаходзяцца ў раёнах па загатоўках, прымусіць райкомы і раённыя выканаўчыя камітэты, а таксама лесапрамгасы разгарнуць работу па дровалесавывазках і ўстанавіць кантроль і нагляд за выкананнем гэтай дырэктывы.

4. Даручыць упаўнаважанаму Народнага Камісарыята Лясной Прамысловасці паведаміць усім упаўнаважаным, якія пасланы для правядзення двухдэкадніка дровалесавывазак, што калі яны не выправяць сваю бяздзейнасць у бліжэйшыя 2—3 дні, яны будуць зняты як упаўнаважаныя Народнага Камісарыята Лясной Прамысловасці і як не апраўдаўшыя давер'я ЦК і СНК.

Адначасова даручыць упаўнаважанаму Народнага Камісарыята Лясной Прамысловасці актывізаваць работу па песасплаву.

Старшыня СНК БССР М. ГАЛАДЗЕД.
Сакратар ЦК КП(б)Б РЫСКІН.

Літаратура і мастацтва

У арткамітэце ССНБ праведзена нарада, прысвечаная абмеркаванню тэматычна-выдавецкага плана Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі на бліжэйшы год. Па дакладу Л. Бендэ разгарнуліся жаркія спрэчкі. Выступаўшыя пісьменнікі адзначалі невыстарчальную ўвагу ДзВВ да паляпшэння якасці літаратурна-мастацкай крытыкі, адсутнасць работы з аўтарам, «марыкаванне» рукапісаў. З другога боку канстатаваліся нярэдкія выпадкі несвачасовай здачы матэрыялаў самімі аўтарамі, выпадкі парушэння асноўных пунктаў дагавораў.

Нарада прыняла рэзалюцыю, у якой вызначан рад практычных прапаноў па паляпшэнні якасці нашай выдавецкай прадукцыі.

Сектарам ЛіМ Дзяржаўнага выдавецтва Беларусі здаюцца ў друк аповесці: Хв. Шынкарэва — «Сонца пад шапкі» і Ю. Віцбіча — «Цяжкая руба» і п'еса Д. Курдзіка «Контр-атака». З паэзіі: «На шляхах волі» — Якуба Коласа і «Чатыры паэмы» Андрэя Александровіча. З класікаў выходзяць з друку ў школьнай серыі творы Францішка Багушэвіча і Цёткі.

— Сектар літаратуры і мастацтва ДзВВ разам з сектарам дзіцячай літаратуры ў канцы гэтага месяца арганізуе абмеркаванне тэматычна-выдавецкага плана на чырвонасцяжным заводзе «Большэвік», з прыцягненнем да гэтай справы шырокіх колаў рабочай грамадскасці, ударнікаў, закліканых у літаратуру, інжынерна-тэхнічных работнікаў.

У часе нарады будзе арганізавана выстаўка ўзораў кніжнай прадукцыі ДзВВ.

— Работа інстытута літаратуры і мастацтва БАН працяжае зараз галоўным чынам у двух напрамках. Ідзе работа над першым выпускам зданай яшчэ ў лістпаді на паліградэктуру гісторыі беларускай літаратуры і адначасова рыхтуецца да друку другі выпуск яе.

— З 15-га верасня ў Менску пачаў гастролі Смаленскі тэатр рускай драмы. Гэта — параўнаўча малады тэатр (гры тады з часу арганізацыі), асноўнае ядро якога складае група актораў — вучняў Казанскай драматычнай студыі З. М. Славянскай. У рэпертуары тэатра: «Мой друг» Пагодзіна, «Егор Булычэв» Горкага, «Коварство и любовь» Шыпера, «Пушкин и Николай I» («Поэт и царь») Лернера і новая камедыя «Кто идет» — Шкваркіна.

Тэатр прабудзе ў нас месяц з лішнім, тэрмін, у часе якога мяркуецца яшчэ пастаноўкі «Поднятой целины» па М. Шолахаву і «Привидения» Г. Ібсена.

Л.

Спіс дакладчыкаў, вылучаных ЦСПСБ і ГСПС для правядзення адзінага прафпалітдня па пытанні зліцця органаў сацстраха з прафсаюзамі 22-IX-1933 года

Завод імя Мясікова — Лісковіч (ЦСПСБ), зав. імя Варашылава—Шупькін (ГСПС), «Камунар»—Піліпенак (ЦП мап.), «Ударнік»—Лабусаў (РШПР), абутк. ф-ка імя Катаповіча — Зайчык (ЦСПСБ), абутк. імя Тэльмана—Дударэў (інсп. працы), шчотачная імя Крупскай — Захарава (ЦП фінб.), абутковая гарсовета — Нейштадт (гарадзкі аховы здароўя), шчацінная — Додзін (ГСПС), фабрыка «Кастрычнік» — Амстэрдзін (ЦСПСБ), фабрыка імя Крупскай — Копелева (ЦП швейнікаў), фабрыка «8 сакавіка» — Бударын (РШПР), ФЗВ «КІМ» — Грэк (ЦП швейнікаў), завод імя Молатава —Багарад (ЦП грамадск. харчавання), фабрыка імя Фрунзе — Шыдлоўскі (ЦП дар.), Эльвід — Шчаглоў (гарМВТ), вадаканалтрэст — Левін (інсп. працы), друкарня імя Сталіна — Будзін (ЦП друкароў), шпалерная — Глазман (ЦП друкароў), шкла завод — Шыпко (ГСПС), кушнерная «1 мая» — Салдаценкава (гарКК), лямцавая — Гнедзько (ГСПС), «Чырв. золак» — Цімошкін (ЦП сельпр.), завод «Беларусь»—Астранеўскі (ЦП сельпр.), мясакамбінат — Цаўлоўская (ЦП мясарыба), малочны завод — Лаўрыненка (ЦП мясарыба), яйка-птушкакамбінат—Ушаноў (ЦП мясарыба), гараж Саюзтранса — Пінкус (ЦП шофераў), групком шофераў), — Белазоўскі (ЦП шофер.), хлебакамбінат — Далідовіч (ЦП МКХ), «Комунарка» — Гурэвіч (ЦП МКХ), трампарк — Саф'ян (ГСПС), Уч. дар. 711 — Мураўскі (ЦП шляхбуд.), 1-я МТС — Коліж (ЦП МТС), 2-я МТС — Казачоў (ЦП МТС), гарком працасветы — Нікалаеў (ЦП працасветы), гарком кааперацыі — Німіфарава (ЦП каапер.), Белкамунбуд — Берэнштэйн (ЦП прамжыл.), ЦЭЦ — Дардзін (ЦП прамжыл.), дом урада — Гольдберг (ЦП прамжыл.), групком № 1 — Іткін (ЦП прамжыбуд), рабфак № 11 — Мееровіч (ЦП прамжыбуд.), УВСР 93 — Бражынскі (ЦП прамжыбуд.), групком № 8 — Маргопін (ЦП прамжыбуд.), УВСР 91 — Крэйнес (ЦП прамжыбуд.), ЦМС будаўніцтва — Васерман (ЦП прамжыбуд.), друкарня Камвуза — Лёушыц (ЦП друкароў), ВЗО — Маслянскі (ГСПС), гарком грамадскага харчавання — Баркан (гарком грамадскага харчавання), каапгас «Большэвік» — Перачынскі («Большэвік»), каапгас імя Варашылава — Андрэеў (імя Варашылава), каапгас «Комунар» — Гарабцоў («Комунар»), каапгас «Кастрычнік» — Галавач («Кастрычнік»), каапгас «Саніжаны» — Ждовіч (рабфак саўг.), хэмфармазавод — Пікус (ЦСПСБ), «Чырвоны хімік» — Добрушкін (страхкаса), «Чырвоны тэкстыльшчык» — Стальмашонак (гар. аховы здароўя), спіртазавод — Файнгауз (ЦП торфсланц).

Вышэйпаказаныя таварышы і старшыні вышэйпералічаных ФЗМК і рабфакомаў павінны з'явіцца 21-IX у памяшканне гарпрафсовета а 7 гадзіне вечара на інструктыўную нараду і атрымаць матэрыялы.

СПІС ДАКЛАДЧЫКАЎ, ВЫЛУЧАНЫХ У ДАПАМОГУ ГРПС ПА ПРАВЯДЗЕННІ ПРАФ.-ПАЛІТДНЯ 22 ВЕРАСНЯ 1933 ГОДА.
АБ ЗЛІЦЦІ ОРГАНАЎ НАРКАМПРАЦЫ І САЦСТРАХА.

МЕНСК:
Лісковіч — ЦСПСБ, Багарад — ЦП Грам. Хар., Фонгаўз — ЦП Тарфяніку, Гурэвіч — ЦП Мукамольнікаў, Зайчык—ЦСПСБ, Грэк — ЦП швейнікаў, Піліпенак — ЦП мапынабуд, Бударын — прафкола, Нікалаеў — ЦП працасветы, Левін — ЦП будаўнікоў, Эльперын — ЦП Лесасплаў, Цімошкін — ЦП сельпрам, Курыцкая — ЦП мукамольн., Мураўскі — ЦП чыг. пас. парт. буд., Захарава — ЦП фін. банк., Хэўлін — НК працы.

ВІЦЕБСК:
Гераўкер — ЦСПСБ, Майзлес — ЦСПСБ, Вігдэргаўз — ЦП шэр. тоўк., Рохкін — ЦП скурнікаў.

БАРЫСАЎ:
Каганава — ЦСПСБ, Гінзбург — ЦСПСБ, Чарноў — ЦСПСБ.

БАБРУЙСК:
Адам — ЦСПСБ, Лабус — Школа прафруху.

ГОМЕЛЬ:
Кавальчук — ЦСПСБ, Лісковіч — ЦСПСБ, Смолікава — ЦСПСБ, Азерскі — ЦСПСБ, Левінсон — ЦП скурнікаў, Валчок — ЦСПСБ, Шлёзберг — ЦП мапынабуд.

МАГІЛЕЎ.
Рубінштэйн — ЦСПСБ, Фіш — ЦП швейнікаў.

ОРША:
Біроцкая — прафшкола, Юдовіч — ЦП мяса-рыбн.

РЭЧЫЦА:
Сільвенскі — ЦСПСБ.

ДЗЯРЖЦЫРК
СУСВЕТНЫ АТРАКЦЫЁН
УСМІРАННЫЯ ДРАПЕЖНІКІ
Берберійскія веліканы ЛЬВЫ 7 рэдкіх экземпляраў
Папулярны совецкі усмірыцель-дрэсіроўшчык дзікіх звераў БАРЫС ЭДЭР.
У ПРАГРАМЕ ПРЫМАЕ УДЗЕЛ УСЯ ТРУПА
Пачатак а 8-30 г.
Кіно „Чырвоная Зорка" а—ад 1 г. дня. КАРАБЕЛЬ НАРАЧОНЫХ драма ў 7 частках
Дзіцячы гукавы кіно-тэатр МЯЦЕЖ па апавяданню Д. Фурманава
Кіно Інтэрнацыянал 19, 20 і 21 верасня НІБЕЛУНГІ 1-я серыя—„Зігфрыд"
„СПАРТАК" Каса з 4 г. дня. З 21 верасня НОВАЯ ПЕРАМЕНА ПРАГРАМЫ

ЛЕНІНГРАДСКІМ ПЛОДАГАРОДНЫМ ІНСТЫТУТАМ
рыхтуючым аграномаў вышэйшай кваліфікацыі, працягнут набор студэнтаў на 1 курс да 20-9-33 г. Іспыты з 25-9 па 1-X-33 г.
Інтэрнатам, стыпендыяй забяспечваюцца на агульных падставах.
Асобы, маючыя закончаную сярэднюю асвету (9-годка, рабфак, тэхнікум і г. д.) але недастаткова падрыхтаваныя да іспытаў, могуць быць прыняты на трохмесячныя курсы па падрыхтоўцы ў інстытут для студэнцкага прыёма 1934 г. Заняткі на курсах з 1-X-33 г. З'яўляцца з пасцельнымі прыладамі.
Адрас: Новый Петергоф, Старо-Знаменский дворец, плодоовощной институт
Дырэкцыя.

ЛЕНІНГРАДСКІ ІНСТЫТУТ СВІНАГАДОЎЛІ
праводзіць набор на падрыхтоўчыя курсы студэнцкага набораў інстытут.
Тэрмін навучання 3 мес. Прыём заяў да 28 верасня. Пачатак заняткаў з 1 кастрычніка. Стыпендыя—45 р. Забяспечанасць інтэрнатам (без сям'і). Узрост ад 17 да 35 год; з асветай не ніжэй 7-годкі.
Адрас: город Красногвардейск, Ленинградской области, проспект 25 октября, институт свиноводства.

Усе студэнты XIX і XX груп
хэміка-тэхналёгічнага факультэту
п. 1, 4, (был. хэміка-тэхналёгічны інстытут) павінны з'явіцца на заняткі 25-га верасня г.г.
Дэкан факультэту Астроўскі.

Кіно „ПРОЛЕТАРЫЙ"
Сёння, 21 верасня і штодзенна
замежны мастацкі фільм
у 2-х серыях—12 частках
КАХАННЕ АМЕРЫКАНКІ
1-я серыя ў 6 частках,
У ГАЛОЎНЫХ РОЛЯХ БЕРНГАРД ГЕТЦКЕ.
Пачатак 1 сеанса ў 6 гадз. веч. Каса адкрыта з 4-х г.

ГОС ХИМ.ФАРМ.ЗАВОД „ФАРМАКОН" ЛЕНИНГРАД
СПЕРМИН ПЕЛЮ
КЛИНИЧЕСКИ ИСПЫТАН И ПРИМЕНЯЕТСЯ В ТЕЧЕНИИ 30 ЛЕТ
при неврастении, половом бессилии, старческой слабости, артериосклерозе и малокровии
ПРОДАЖА ВО ВСЕХ АПТЕКАХ И МАГАЗИНАХ САНИТАРИИ И ГИГИЕНЫ С.С.С.Р.
ИМЕЮТСЯ ТАКЖЕ В ПРОДАЖЕ:
ОВАРИН, МАМИН, ПЕПТОН, ФОЛИКУЛЕН, ПИТУИТРИН, ТИМОФИЗИН, АСТМОЛИЗИН, ТИРЕОИДИН

У сувязі з ліквідацыяй філіяла ЛЕНКРАЙДАМЭЦ'а па БССР і стварэння Беларускага аддзялення ДАМЭЦ'а з 1-га верасня г.г.
усе ўстановы, прадпрыемствы і прыватныя асобы павінны падаць маючыяся да філіяла ЛЕНКРАЙДАМЭЦ'а прэтэнзіі не пазней 25 верасня.
Пасля паказанага тэрміна ніякія прэтэнзіі прымацца не будуць.
БЕЛДАМЭЦ.

Рэдакцыя час. «БАЛЬШАВІК БЕЛАРУСІ» паведамляе сваіх падпісчыкаў, што 23 верасня выйдзе з друку 19-ты (жнівеньскі) нумар з наступным зместам:

Перадавы. — Загатоўкі — у цэнтр увагі.

Любімаў. — АС рабоце лёгкай прамысловасці Беларусі.

Сахарава. — Да вынікаў чысткі фабрычна-заводскіх і вясковых ячэек і задачы чысткі ячэек савецкага апарата.

Малышаў. — Аб перабудове партработы з вопыта паліцаддзела Жлобінскай МТС.

Андросік. — Да перабудовы клімавіцкай вясковай партарганізацыі.

Дзмітрыеў. — Першыя вынікі работы калгаснай ячэйкі (калгас Дзяржынск, Лагойскага раёна).

Жукаў.—Аб уборцы, пастаўцы збожжа і падрыхтоўцы да асенняй сяўбы па Асіпавіцкім раёне.

Пастанова бюро ЦК аб практычных мерапрыемствах па умацаванні кіраўніцтва калгасамі.

З верасня часопіс выходзіць 2 разы ў месяц.

РЭДАКЦЫЯ.

Сёння 21-IX—а 8 вал. гадз. увеч. у клубе медсанпрацы
— адбудзецца —
АГУЛЬНЫ СХОД
усіх зубных дактароў, ленкомаў, акушорак, і медсясцёр г. Менску
па пытанню аб пасылцы на раён.
Яўка абавязкова і без спазнення.
Менгарздраў Найштадт.
ЦП саюза Медсанпрацы Драбінскі.

Навучальны камбінат „СОЮЗОРГУЧОТ"
паведамляе, што НАБОР у II гарадскую групу рахуннавода